і кажа: найгорш з харчамі, бо хата то е. Кіраўніку хата спадабалася. „Z jakimi krzakami? To my może wytniemy?” Дык і сталаваліся, мне было добра з панамі, не зачыняла, не абакралі, найвышай хлеб спяку, як выплата, то з’ядуць раз-два той хлеб. І смятана тым панам так смакавала. Былі Ярмоц, Самойлік і Куснер. Пайшлі потым да іншых, і зноў вярнуліся. Пасля, калі ўжо возера рыхтавалі, тыя паны прыйшлі да нас і кажуць: „Musicie uciekać”. Боўтрыкі затаплялі, то мы яшчэ ў Рудні былі. Вада падыходзіла пад Косцеву хату, Коля памагаў выносіць, ужо кладку рабілі да Боўтрык. Сцяпан Кардаш на парозе сядзеў, не мог нікуды выйсці. А хто то хацеў кідаць хату! Той Сцяпан урэшце здурэў, жонку выганяў, жонка ў скрыні спала. Цяпер ходзіць па Беластоку. Мы запісаліся да Бандароў. Нашы тыя паны хацелі, каб мы запісаліся на Луку, да Стоцкіх. Каб хаты перацягнуць, каб будынкі свае адкупіць. На адны таргі паехалі, але пасля кінулі. Нас на вельмі мала выцанілі. Я паехала ў Беласток да Ніны і да Колі, кажу Колю: „Хату пакінулі нам, каб мы перабудоўваліся”. А ён кажа так: „Дайце сабе *спокуй*, бо мяне не пусцяць з паліцыі на *ўрлёпы*! Ці вы тую хату будзеце цягаць самі?”. Блёкі ўжо былі, мы прыйшлі апошнія да блёку. Ужо на Каляды былі гатовыя, тры разы егдзілі, усё пазабіралі. Каляду елі першы раз ужо тут. Закалолі адразу двое свіней, прадалі астатніх ужо кароў, каня... Бацька, Коля, пайшоў плачучы ў Боўтрыкі сказаць што няма ўжо кароў. Ён і коней так любіў!

Кацярына Рыгаровіч-Янушка памерла ў 1988 годзе. У 1985 г. паявіўся яе адзіны верш у „Ніве” – пра мір, па-руску. У вершы (з 1968 года) Віктару Шведу напісала: *Я умру – как все умирают. Жизнь исчезнет моя без следа. Над могилой моей одинокой зашумит ветерок иногда...*

Міра Лукша

Адстойваў родную мову

Вельмі часта прыгадваю свайго таленавітага і адкрытага душой земляка Сцяпана Міхайлавіча Міско (1930-2010). Калі ён прыязджаў на Слонімшчыну, то забягаў да мяне ў рэдакцыю раённай газеты, дзе я працаваў. Але пры сустрэчах ён ніколі пра сябе не расказваў. А калі я наведваў Мінск, то таксама заходзіў да яго на працу ў Кніжную палату на былым праспекце Машэрава, 11.

Аднойчы я асмеліўся і запытаўся ў яго: «А ці праўда, Сцяпан Міхайлавіч, што гэта вы напісалі радкі пра былога міністра культуры СССР Фурцаву?». Сцяпан Міхайлавіч усміхнуўся і нагадаў гэтыя радкі:

Я нічога не баюся –
Я на Фурцавай жанюся:
Буду шчупаць цыцкі я
Самыя марксісцкія!

Такая прыпеўка-жарт была дарэчы, бо кандыдат мастацтвазнаўства, культуролаг Сцяпан Міско ўсё сваё жыццё аддаў гісторыі тэатра. А многія рэспубліканскія пытанні тады ў тагачаснай савецкай імперыі без Масквы не вырашаліся. А культуру на «необъятных просторах СССР», сапраўды, курыравала таварыш Фурцава. Таму ажыццявіць беларускія культурныя планы такім людзям, як Сцяпан Міско, так і не ўдалося. Проста ім не давалі. А гэтых планаў было шмат.

Сцяпан Міско нарадзіўся 18 студзеня 1930 года ў вёсцы Чамяры Слонімскага павета. Вучыўся ў мясцовай пачатковай школе, пасля скончыў беларускую школу № 1 г. Слоніма і Мінскі інстытут замежных моў. Пра сваё маленства Сцяпан Міско згадаў у сваім артыкуле «Вёска Чамяры», які быў апублікаваны ў 1968 годзе ў часопісе «Полымя»: „Маленства прайшло ў панскай Польшчы. Мы не разумелі тады, што такое акупацыя. Бачылі, як ловяць людзей, гоняць у турмы, толькі мы не здагадваліся, што гэтыя людзі хацелі лепшай долі для ўсіх. У школе крышку разабраліся. Там з першага класа на пытанне:



Сцяпан Міско

„хто ты такі?" – павінны былі адказаць:

– Паляк малы.
– Які знак твуй?
– Ожэл бялы…

Беларускіх і рускіх кніг у вёсцы было шмат. Мы іх чыталі дома, ведалі напамяць: „Я мужык-беларус, пан сахі і касы", „Ярка на камінку смольны корч палае", „Хто ты гэткі? Свой, тутэйшы". І пазней ужо адчулі, што ніякія мы не палякі, што тутэйшы – значыць, беларус. Некаторыя польскія песні і вершы нам падабаліся, бо ў іх расказвалася аб такім жа сялянскім жыцці, як і наша:

W poniedziałek rano
Kosił ojciec siano.
Kosił ojciec, kosił ja,
Kosiliśmy obydwa...

Або пра пастушка, які прасіў сонейка, каб хутчэй заходзіла, „bo mi nóżki bolą za gąskami chodzić". Такое самае было і наша маленства.

Падрос да гадоў шасці ды ў пастушкі. Пачынае світаць, а маці ўжо будзіць. Спачатку ласкава: „Сынок, сыночак…". А потым і дубца пакажа. Нічога не зробіш, трэба. З пастушка ў барану, з бараны ў граблі, ад грабель да касы і плуга – такі шлях вясковых хлапчукоў заходнебеларускай вёскі майго пакалення".

Пасля заканчэння інстытута, Сцяпан Міско вярнуўся ў Слонім. У пасёлку Альбярцін (цяпер мікраraён Слоніма) у сярэдняй школе шэсць гадоў выкладаў французскую, нямецкую, беларускую і рускую мовы. У 1958 годзе паступіў у аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Затым працаваў у гэтым інстытуце (завочна вучыўся ў дактарантуры на кафедры тэатра народаў СССР у Маскоўскім інстытуце тэатральнага мастацтва.

У 1962 годзе ў Кіеве ў самога Максіма Рыльскага абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму „Вытокі беларускага народнага тэатра". Пасля абароны кандыдацкай дысертацыі, шмат пісаў, апублікаваў больш за сотню артыкулаў у рэспубліканскіх газетах, часопісах, зборніках і альманахах, прысвечаных беларускаму тэатру, літаратуры, жывапісу, музыцы. Напісаў і доктарскую дысертацыю на тэму „Беларускі тэатр ад вытокаў да першай паловы XVIII стагоддзя". Дысертацыю абмяркоўвалі, адобрылі, але абараніць яе Сцяпан Міско не паспеў. У 1974 годзе яго звальнілі з працы з Акадэміі навук БССР, дзе працаваў старэйшым навуковым супрацоўнікам. „Нас выгналі тады за „неправильные взгляды по национальному вопросу", – расказаў неяк мне Сцяпан Міхайлавіч. – Выгналі мяне, Міколу Прашковіча з Інстытута літаратуры, Вячаслава Рабкевіча з БелСЭ, Алеся Каўруса з Інстытута мовазнаўства, Міхася

Чарняўскага з Інстытута гісторыі. Патраслі некаторых хлопцаў і ў Гародні. Мяне трымалі ў КДБ роўна 6 дзён і ўсё вялі допыт. Зрэдку адпускалі паесці, а пасля зноў дапытвалі. А пасля, як п'яніцу, адправілі на 10 дзён спачатку ў медвыцвярэзнік, а пасля – убіраць смецце і працаваць на Мінскім маторным заводзе. А потым адпусцілі…".


Віна Сцяпана Міско, паводле інфармацыі КДБ у партыйныя органы, перадусім у ЦК КПБ, заключалася ў нацыяналістычнай пазіцыі, а фактычна ў тым, што ў сваіх публікацыях у перыядычным друку і ў публічных выступленнях на з'ездах творчай інтэлігенцыі, Сцяпан Міско адстойваў правы беларускай мовы, казаў пра яе нераўнапраўнае становішча ў БССР. Ён прымаў актыўны ўдзел на старонках газеты „Літаратура і мастацтва" і часопіса „Нёман" у дыскусіях пра лёс нацый і моваў, дзе практычна раскрытыкаваў афіцыйную канцэпцыю таталітарнага рэжыму пра зліццё моваў як беспадстаўную і псеўданавуковую. Сцяпан Міско раскрытыкаваў вядучых артыстаў Беларускага Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, якія дрэнна размаўляюць па-беларуску на сцэне падчас спектакляў…

У абарону і падтрымку Сцяпана Міско выступіў на старонках „ЛіМа" і Ніл Гілевіч. 17 снежня 1963 года ён пісаў: „Ужо не першы год чуюцца галасы справядлівага абурэння тым, што многія акцёры беларускіх тэатраў валодаюць беларускай мовай так, што каб і хацеў горш, дык нельга. Нядбайныя, абыякавыя адносіны акцёраў да слова зніжаюць ролю тэатраў у справе эстэтычнага выхавання працоўных. Голасам шчырай заклапочанасці з гэтага повада з'явілася выступленне Сцяпана Міско. Аўтар прыводзіць канкрэтныя і пераканаўчыя прыклады, калі нават вядучыя акцёры Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы не клапоцяцца аб чысціні мовы і правільным літаратурным вымаўленні. Сапраўды, крыўдна: акадэмічны тэатр – і раптам такія моўныя адвольнасці, такое грубае парушэнне норм беларускай арфаэпіі! У гэтым – сэнс і пафас выступлення Сцяпана Міско, і кожны непрадузяты чытач не можа з ім не пагадзіцца.

Сцяпан Міско не збіраўся пісаць навуковы артыкул па мовазнаўству – ён сказаў аб тым, што ўжо даўно непакоіць многіх і многіх шчырых прыхільнікаў нашага тэатральнага мастацтва. Дарэчы, і яго парады не



Іван Цішчанка, Арсень Ліс і Сцяпан Міско (злева направа) у Мінску, 1963 г.



Вокладка кнігі Сцяпана Міско

такія ўжо абсурдныя. Напрыклад, пазнаёміцца з „Дыялекталагічным атласам беларускай мовы" было б вельмі карысна для кожнага акцёра, хаця, зразумела, не ў гэтым галоўны выхад са становішча. Галоўны выхад Сцяпан Міско справядліва бачыць у тым, каб акцёры карысталіся сваёй рабочай мовай не толькі на сцэне, але і ў штодзённым побыце…".

Па ўспамінах Сцяпана Міско, самае галоўнае тады для КДБ было „арганізаваць" нацыяналістычную групоўку. Але групоўкі той ніякай не існавала. Хлопцы з сем'ямі па 15-20 гадоў жылі тады без кватэр у акадэмічных інтэрнатах, бо займаліся беларускай культурай. Што ведалі адзін аднаго, дык не маглі не ведаць. Што пісалі пра старажытную гісторыю, культуру і мову беларусаў, дык так наканавана ім было. Што яны аднолькава думалі пра трагічную гісторыю свайго народа і хацелі для яго лепшай будучыні, дык так думалі ўсе шчырыя беларусы.

Сцяпана Міско нават выклікалі на бюро ЦК КПБ перад пленумам 1974 года. Там першы сакратар ЦК КПБ Пётр Машэраў цэлую гадзіну чытаў яму натацыі, што ў нас адзін савецкі народ, што ў нас будзе адна мова і г.д. А потым пачаў крычаць на яго: „Нашёлся свядомый белорус. Поживёшь два года без работы, вот посмотрим, как ты запоёшь…

Ты думаешь, если бы ты стал руководителем республики, так сразу все и заговорили бы на белорусском языке…”.

Але Сцяпан Міско не маўчаў, адстойваў свой пункт гледжання. Праўда, пасля бюро ЦК КПБ, два гады ён не змог нідзе ўладкавацца на працу. А пасля ўсё ж яго ўзялі ў Дзяржаўны музей БССР. А перад пенсіяй – працаваў намеснікам галоўнага рэдактара ў выдавецтве „Універсітэцкае”.

У 2000 годзе асобным выданнем выйшла з друку кніга Сцяпана Міско „Школьны тэатр Беларусі XVI-XVIII стст.”. У ёй аўтар найбольш поўна даследаваў тэатральнае мастацтва Беларусі перыяду сярэднявечча. Кніга складаецца з трох раздзелаў. У першым раздзеле даследчык расказаў пра тое, як узнік школьны тэатр і што сабой уяўляў яго рэпертуар. У другім раздзеле асаблівую ўвагу ўдзяліў аналізу інтэрмедый, якія ляглі ў аснову прафесійнай беларускай драматургіі. А ў трэцім раздзеле ў скарочаным выглядзе даецца змест асобных інтэрмедый.



Выпускнікі Слонімскай беларускай СШ № 1 сустрэліся праз 40 гадоў. У трэцім радзе другі справа Сцяпан Міско. 1988 г.

Вядома, Сцяпан Міско гэтым выданнем не прэтэндуе на вырашэнне ўсіх праблем, звязаных з развіццём школьнага тэатра ў Беларусі. Будучым даследчыкам давядзецца яшчэ перакласці на беларускую мову ўсе тэксты драм, якія пісаліся і ставіліся на тэрыторыі Беларусі на лацінскай і польскай мовах, выявіць многіх невядомых да гэтага часу драматургаў школьнага тэатра, даследаваць больш шырока тэорыю і практыку школьнага тэатра. Аднак і тое, што нашаму земляку ўдалося адшукаць у архівах і старых выданнях, вельмі карысна для тых, хто цікавіцца гісторыяй беларускага тэатра...

Падчас адной з сустрэч пры жыцці Сцяпан Міхайлавіч Міско неяк сказаў мне: „Калі будзеш штосьці пра мяне пісаць, не забудзь згадаць, што я з’яўляюся сябрам Саюза беларускіх тэатральных дзеячаў з 1964 года”. Што я і раблю.

Сяргей Чыгрын

Я не герой сваёй эпохі

Яго галава была вельмі цяжкая, так ніколі яшчэ не балела. Зусім перабольшыў, дурань! Ах, як баліць! Ці гэта ён адбывае падарожжа самалётам? Праўда, меў ён ляцець у Амерыку, там хацеў папрацаваць і вярнуцца. Ну, ён так хацеў, штосьці там думаў пра гэта, але каб так адразу ў самалёт і ляцець? Страціў мо розум, ці што...

Якраз Максім Лутоўскі выйшаў на ганак хаты сваіх бацькоў і прытрымаўся парэнчы сходаў. Дом быў вялікім будынкам, з шэрагам акон, крыху нагадваў колішні панскі двор. Чакаць, думаў ледзь стаяўшы на лесвіцы, то ж я ў нейкую Амерыку і не выбраўся. З нейкай цяжкасцю Максім прыгадаў сабе выпадкі сённяшняга дня і схапіўся за галаву, які ён смешны! Быў на факультэце і стаў магістрам эканоміі, а пасля пайшлі цэлай камандай у клуб. Папілі здорава! Памятаў, Караліна прычапілася, хацела гаварыць аб іхніх адносінах... Загадаў ёй адысці, паляпаў па спіне і на канец прытрымаў за руку. Хацеў хутчэй да хлопцаў, гарэлкі ці піва напіцца, а тая не адпускала. На канец сказаў ёй, што не маюць аб чым думаць, што паміж імі штосьці стаіць. Ну і меў плач дзяўчыны, якая так яго палюбіла.

Цяпер ведаў, дзе ён, скуль ён і чаму так яму баліць галава. Найлепш было б пакласціся спаць, каб не чуць гэтага калыхання ў галаве. Не будзе ён думаць і аналізаваць сваіх паводзін наконт Караліны. Яна адазвецца ў нейкі дзень і тады цвяроза паскладваюць што там паміж імі. Адчыніў вялікія і цяжкія, драўляныя дзверы і ўкаціўся ў сярэдзіну. Адбіваючыся ад сцяны да сцяны, Максім дабраўся ў свой пакой. Дзякуй Богу, што яго дахаты калега адвёз! Шмат дарогі з горада ў яго мясцінку. Ну і ёсць. Хлопец упаў на салідны драўляны ложак, нават не распранаўся. Не меў сілы. Хто будзе мець прэтэнзіі, ён ужо магістр, абараніўся на пяцёрку. А цяпер адпачываць...

Хтосьці пастукаў у акно, вельмі далікатна, баязліва. Можа вецер галінкаю гуляў, а людзі як людзі, зараз прыдумаюць сабе нейкія страшылкі... Стукатанне не моўкла і чалавек ляжаўшы ў прыемна цёплай пасцелі рашыў расплюшчыць вочы.

Пры флігелі стаяла дзяўчынка і цярпліва стукала ў акно. Ён звар'яцеў, не адчыняе, а яна ніколі не падыдзе да парадных сходаў. Хутчэй тут замерзне і пахаваюць яе на вясковых могілках у найпрыгажэйшай сукенцы побач маці ў сямейнай грабніцы. Цяпер пастукала кулаком, і гэта дало рэзультат. Прачнуўся! – узыдхнула светлавалосая прыгажуня. Стаяла пад акном хвілін сорак! Акно расчынілася і паказаўся прыгожы твар бацькавага аканома.



Фота Міры Лукшы

Максім вельмі хацеў даведацца, як ён трапіў у іншае месца. Здавалася, што памяць вярнулася яму на ганку хаты і ён спакойна паклаўся спаць. Зараз, аднак, прачнуўся і пачуў неспадзяваны пах паленых дроў. І зноў стукатанне, цяпер гучнае і выразнае. Устаў раптоўна і зноў жаласна схапіўся за галаву. Яна была надалей цяжкаватая і алкаголь напэўна кружыў у арганізме. Вось і маеш вынікі выпівання! Не выцверазеў. Зачапіўся аб крэсла. Дзіўная рэч, у яго пакоі не было ніякіх крэсел! Заспанымі вачыма азірнуўся навокал і не мог зразумець, што за сон. Шэрань пакрывала шыбу невялікага акна, так што не бачыў, хто стаіць з акном. Прыадчыніў акно, і холад уварваўся ў пакой.

– Цябе маглі б падпаліць! – наракала незнаёмая дзяўчына. Акутаная акуратнай хустай, апранутая зусім нямодна, быццам з іншай эпохі, дзеўка выглядала вельмі асабліва. Ну а што ён? Паглядзеў на свае штаны. Не джынсы, у якіх баляваў, а цёмныя штаны ў абцяжку. Адкуль іх узяў і каму ўдалося іх нацягнуць на яго? Даў сабе ўдосталь! Значыць, алкаголь не для яго. Праўду казала маці, то такія рэчы – для мудрай галавы.

– Ты папіў, Максім! Я чую! – расхвалявалася дзяўчына.

– Так, але я не ведаю, адкуль ты ведаеш аб гэтым. І дзе я апынуўся?

– Трымайце, нябёсы! Бачыла, як бацька даставаў бутэльку.

– Чый бацька?

– Мы ж гаварылі, трэба ранкам дабрацца ў Белавеж. Потым усе даведаюцца.

Максім здурэў. Фатальна здарылася, што раней не адмаўляўся, а так – напіўся і маеш, прыйшоў у чужую хату, пазнаёміўся з бацькам гэтай дзяўчыны і яшчэ выпіваў з ім! От, ліха!

– Чакай, дзяўчынка, – апёр рукі на падваконніку. – Ты ведаеш, як мяне завуць і выглядае, што шмат іншых рэчаў, але я бачу цябе першы раз. І не прапамінаю сабе, як я сюды ўвогуле трапіў. Знаемся ад вечара а ты хочаш каб я з табою ехаў у Белавеж. І што там?..

Дзяўчына адчыніла шырока вочы і паклала рукі на клубах. Напэўна, не спадабалася ёй тое, што ён сказаў.

– Ты, мяне, хлопец, – слова „хлопец" вымавіла асабліва, – вывядзеш з сябе. Хутчэй, коней я ўвязала пры дарозе, а калі будзеш марудзіць, паеду адна, а табе крэсцік.

Дзяўчына кранулася з месца і адышла некалькі крокаў. Максім выхіліўся за акно. Сукня дзяўчыны была незвычайная, і ўсё тут было сенсацыйным. І чамусь прыйшло яму ў галаву, што трэба ісці за светлавалосай. Прынамсі пабачыць ён, дзе апынуўся, гэта вельмі цікава. А цяпер загадку трэба развязаць. Ну і дахаты дабрацца. Выскачыў з акна і зрабіў некалькі крокаў, азірнуўшыся на будынак у якім спаў. Драўляны, надзіва падобны на прыдворскія флігелі. А навокал лес, яго пушча. Белавежская пушча, калі яны выбіраюцца ў Белавеж. Чакаць. Чакаць... Што яна сказала? Коні? Свет перакуліўся дагары нагамі. Нашто каму звяры, калі конская сіла ў машыне? Аднак людзі бываюць усялякія...

Максім дагнаў дзяўчыну, якая, убачыўшы яго побач сябе, усміхнулася ўлагоджана.

– Дурань! – сканстатавала. – Як стаяў, так упаў і заснуў.

Пакруціла галавой, а ён прыглядаўся да яе твару. Красуня.

– Увесь двор будзе насміхацца.

Хлопец глянуў на сваю адзежыну і даўся дзіву. Ну што за апранахі! І яна ў гэтай сукні...

– Слухай, – пачаў Максім. – Я ўчора напіўся. Святкаваў сваю магістэрку, але якасьці, якасьці... трапіў дахаты. А што я тут раблю?

– Максім, мо ты ўдарыўся? Учора мінуў год як ты з намі.

– З вамі? Гэта з кім?

– Доктара! – тэатральна крыкнула дзяўчына, прыклала сваю далонь да яго ілба і махнула галавой.

– Ты, Максіме, для мяне найдаражэйшы ў свеце, таму я прашу, не выпівай больш і зрабі з сабой парадак. Калі ты маеш даведацца, чаму вырэзваюць нашу Пушчу, ты

Працяг на 31 стар.

Я не герой сваёй эпохі

(працяг з 26 стар.)

павінен быць цвярозым і разумным. А ты цяпер – гультай!

– Добра, значыць, я праспаў цэлы год. Так разумею?

Дзяўчына гучна засмяялася.

Максім падумаўшы глыбока сцвердзіў, што ён надалей у сне.

Дайшлі да звяроў, прыгожых і дагледжаных, і Максім спалохаўся. Ён ніколі не прабаваў гэтага спорту. І ў што ён улез? Аднак, хаця баяўся, падсадзіў дзяўчыну на каня і... Здзівіўся, як лёгка закінуў ступак у стрэмя і ўскочыў на сядло. І цуда – Максім ведаў, як паводзіць сябе, каб конь добра ішоў!

Дзяўчына кінула на Максіма зусім панскім паглядам:

– А, я ведала, што табе гэта добра зробіць.

Максім з маналогу дзяўчыны дадумаўся, што маюць яго за кіруючага маёнткам, а двор у якім служыць завуць Лутоўня. Ага, значыцца, так: ён напіўся і заснуў, але гэта не кашмар. Тут адбылося нешта незвычайнае. Яго кінула ў іншую эпоху, ці што? А дзяўчына, значыцца, Аня, дачка гаспадара Лутоўні. Максім увасобіўся ў ролю чалавека, аб жыцці якога нічога не ведаў. Вось такая гісторыя! Прытым адбываецца штосьці цікавае і яны наважылі зрабіць нейкае расследаванне. Як ён меў ад гэтага адмовіцца? Амаль ужо прывык да бліскучай весткі, што ён гэта не ён, а хтосьці зусім не Максімаў, хаця таксама гучаць іхнія імёны і прозвішча.

Максімава фантазія калісьці схільвалася ў тыя старыя часы, ён цікавіўся сваімі прашчурамі, але не памятаў, каб хтосьці з продкаў быў дворскім аканомам. Адзін быў лекар, другі слуга ў двары, трэці – манах...

– Слухай, успомні, чаго мы так едзем.

Рашыў прыняць удзел у гэтай прыгодзе. І выкарыстаць час, запамятаць усё. Дашукаецца пасля, хто тут хто і для чаго. Хіба што не вернецца...

– Я катэгарычна пратэстую! Там палацовыя будаўнічыя вырэзваюць нашу даброву. Усю пушчу знішчаць!

– А мы нейкія хвасты, што надумалі ім у гэтым перашкодзіць?

Ён цяпер хацеў смяяцца. Зразумеў. Гэта канец дзевятнаццатага стагоддзя. Будуюць царскую паляўнічую рэзідэнцыю.

– Ну, Максім, – збянтэжылася і пачырванела дзяўчына, – хаця б пабачыць...

– Ты ведаеш, што за сто гадоў будуць эколагі, якія будуць абараняць пушчу перад такімі будаўнічымі. А палац будзе знішчаны.

Цяпер смяялася яна.

– З цябе някепскі жартаўнік, я ведаю. Такога ты яшчэ не выдумляў.

Прыехалі ў Белавеж. Яна была зусім інакшая, чым вядомая Максіму. На горачцы ўзносілася вялікая канструкцыя. Царскі палац.

Цуда! Максім разявіў рот.

– Бачыш, як гэта можна знішчыць? Трэба гневу гасподняга да разбурэння гэтага.

– Не трэба, – сказаў засмучаны Максім. – Хопіць крыху людзей, у якіх няма парадку ў галаве. Або вайна...

– Сёння ты філасофствуеш...

– А сюды ўзлезці можна?..

– Я ўжо ўпэўнена, што ты сапраўды ўдарыўся ў галаву. Давай, да бабулі Зіны. Яна знойдзе на цябе сілу!

– Як гэта?

– Так як і на мне, як я прыхварэла.

Павяла красуня Максіма да простай хаты, за якой валіўся плот. Пры самай сцяне сядзела маленькая, сухая жанчына. Пазнала дзяўчыну. Аня абняла старушку як родную бабулю і абцалавала ёй шчокі. На Максіма бабка паглядзела насцярожана.

– І бачыш, што тут робіцца? – спыталася ў яго.

– Цар строит себе чудо, – сказаў Максім.

– І што будзе з намі? Пойдзем усе, рабы, рабіць. Работаць, работаць, і ўсю жызнь пасвяшчаць.

– Гэта ненадоўга, – сказаў бабулі Максім.

– Анулька, ты ідзі, нарві парэчкі. Зварыце кампоту.

Максіма старуха ўзяла за руку павяла да сваіх парогаў.

– Ты не павінен тут быці, – яна была строгая і сур'ёзная. – Бесы, цьфу, чарты, адыдзіце! – махнула рукою, а Максіма пераняли дрыжыкі...

– Яе зваліла з ног, а мне пачала балець галава, круціліся самалёты ў ілбе, нядобра зрабілася, – расказваў Ані Максім. – Я хацеў накрычаць на бабулю, а мне мову адняло! У галаве палац, дубы, коні, флігель двара ў Лутоўні...

– Максіме, з табою зноў бяда, – уздыхнула дзяўчына.

Адплюшчыў вочы і ўбачыў белую столь.

– Падумаеш, адукаваны чалавек! Але! „Прашчай розум, здраствуй дурната!" Андрэй, твой сын у цябе ўдаўся, я з ім не маю нічога супольнага! – лямантавала маці.


Максім меў ахвоту выпіць усю ваду свету.

– І пабач! Хадзі пабач! – клікала маці Максімавага бацьку. Значыць, ён у сябе, а ўсё гэта быў сон! – Глянь, Андрэй, што ён на сябе надзеў! Скуль ён такое ўзяў?!. У тэатры, ці што? Нават не разбуўся!

Прыйшоў бацька і ледзь на яго глянуў. Відаць, сын выглядаў камедна! Але! Максім устаў і адчуў, як сэрца хутчэй працуе. На нагах меў высокія боты Максіма, аканома Лутоўні.

– Халера! – аблаяўся пад носам, бо маці клікала ўжо ўсю радню, каб пабачылі, як Максім адсвяткаваў сваю магістэрку.

Паўліна Бяляўская



Календарыюм

Травень – гадоў таму

930 – у 1085 г. дружыны Полацкага княства на чале з князем Усяславам Чарадзеем абаранілі беларускія землі ад захопніцкага нашэсьця князя кіеўскага Усяслава Манамаха. Захопнікі зьнішчылі Менск. Як пісаў кіеўскі летапісец „*Не засталося ні чалавека, ні жывёлы*”.
710 – напады крыжакоў у 1305 г. на Гарадзенскую зямлю ды аблога імі Гарадзенскага замка.
450 – 29.05.1565 г. памёр Мікалай Радзівіл Чорны (нар. 4.02.1515 г.), палітычны, культурны і рэлігійны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, з 1550 г. канцлер ВКЛ, выступаў за сувэрэннасьць ВКЛ у Рэчыпаспалітай, вызнаўца кальвінізму і яго прапагандыст на землях ВКЛ, у 1553 г. заснаваў друкарню пры Берасьцейскім зборы; пад яго апекай існавала таксама друкарня ў Несьвіжы. У 1647 г астанкі яго і жонкі перанесены былі ўрачыста з Вільні ў Дубінкі (Літва).
400 – выданьне ў 1615 г. сацыяльна-палітычнага трактату беларускага гуманісты ды мысьліцеля Міхалона Літвіна „*Аб норавах татараў, літоўцаў і масквіцян*”.
395 – пачатак пабудовы ў 1620 г. касьцёла кармэлітаў у Бераставіцы (непадалёк сучаснай мяжы з Польшчай). З 1866 г. праваслаўная царква.
215 – 31.05.1800 г. у Варшаве памёр Міхал Казімір Агінскі, вялікі гетман літоўскі (з 1768 г.), мэцэнат, ініцыятар пабудовы каналу Агінскага. Пры сваім двары ў Слоніме стварыў у 1765 г. оперны тэатр і капэлу.
170 – 3(15).05.1845 г. у фальварку Свольна на Віцебшчыне нар. Іван Чэрскі, геоляг і географ. За ўдзел у студзеньскім паўстаньні сасланы ў Омск, дзе праводзіў геалягічныя дасьледаваньні ваколіц. Памёр 25.06.(7.07)1892 г. падчас экспэдыцыі ў пасёлку Калымскім каля вусьця ракі Амалон.
160 – 11.05.1855 г. Яўстафій Тышкевіч заснаваў у Вільні музэй старажытнасьцей. Большасьць экспанатаў была з тэрыторыі Беларусі.
135 – 25.05.1880 г. у фальварку Лябёдка на Навагрудчыне нарадзіўся выдатны грамадзка-палітычны дзеяч Вацлаў Івваноўскі. Між іншым быў адным з заснавальнікаў першага беларускага выдавецтва „Загляне сонца і ў наша аконца”. Забіты 07.12.1943 г. у Менску.
120 – 27.05.1895 г. у вёсцы Пагіры на Навагрудчыне нарадзіўся Ігнат Дварчанін, грамадзка-палітычны дзеяч, дасьледчык творчасьці Францішка Скарыны. Забіты НКВД 8.12.1937 г.
115 – 27.05.1900 г. у вёсцы Макашы на Навагрудчыне нарадзіўся выдатны беларускі паэт Уладзімір Жылка. Быў студэнтам Унівэрсытэту ў Празе. З 1926 г. жыў у БССР. З 1930 г. перасьледаваны савецкімі ўладамі, быў арыштаваны ды сасланы ў глыб Расіі. Памёр 1.03.1933 г. Друкаваўся з 1920 г. Ягоная паэтычная творчасьць зрабіла станоўчы ўплыў на рамантычную плынь беларускай паэзіі.
110 – 6.05.1905 г. у Слуцку нар. Юрка Гаўрук, перакладчык м.інш. драмаў У. Шэкспіра на беларускую мову: „Сон у летнюю ноч” (1925), „Гамлет” (1935), „Атэла” (1954), „Канец – справе вянец” (1964), „Кароль Лір” (1974), „Антоній і Клеапатра”, якія ставіліся ў беларускіх тэатрах. Закончыўшы Вышэйшы літаратурна-мастацкі інстытут у Маскве ў 1925 г, выкладаў замежную літаратуру ў Горацкай Сельскагаспадарчай Акадэміі і ў Магілёўскім пэдагагічным інстытуце; у 1935 г. рэпрэсіраваны і высланы з Беларусі ў Сібір, дзе прабыў больш за 20 гадоў. Рэабілітаваны ў 1956 г., у 1957-1967 гг. – памочнік галоўнага рэжысёра па літаратурнай частцы Беларускага Дзяржаўнага Акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы. Памёр 18.02.1979 г.
110 – 15.05.1905 г. быў упершыню надрукаваны верш Янкі Купалы „Мужык” (у газэце „Северно-Западный Край”).
105 – 18.05.1910 г. у Гродне памерла Эліза Ажэшка-Нагорская (нар. 6.06.1841 г. у маёнтку Мількаўшчына на Гродзеншчыне), польская пісьменьніца, аўтарка м. інш. рамана „Nad Niemnem”.
90 – 22.05.1925 г. выйшаў з друку апошні, 36 нумар выдаванай у Віль-

ні газэты „Беларуская Доля”. Зьмяшчала яна апрача публіцыстычных ды літаратурных тэкстаў, таксама карэспандэнцыі, між іншым зь Беласточчыны.

75 – 18.05.1940 г. у Дубічах Царкоўных нарадзіўся Ян Чыквін – паэт, перакладчык, літаратуразнавец. Друкуецца з 1957 г. Старшыня Беларускага Літаратурнага Аб’яднаньня „Белавежа”. *Віншуем з юбілеем!*

70 – 8-9.05.1945 г. капітуляцыя фашыстоўскай Нямеччыны. Канец II сусьветнай вайны ў Эўропе.

70 – 13.05.1945 г. памёр ад ран Сяргей Крывец (нар. у 1909 г.), паэт; у гг. 1933–1944 жыў у Беластоку, вучыўся ў Беластоцкім Пэдагагічным Інстытуце (1940-1941), публікаваў вершы ў „Новай Дарозе”.

Апрацавалі **Лена Глагоўская** і **Вячаслаў Харужы** ■

Leon Moenke

Tundra

5. Zbieraliśmy się już do drogi. Lecz nie tak to było łatwe. Gospodyni nastawiła wodę na herbatę i nie chciała nas puścić bez tego „smakołyku”. Chociaż jedliśmy tylko zimne dania i na domiar żona przemokła, to jednak zbyt długi tutaj pobyt rodził niebezpieczeństwo. Lada chwila mogła zawitać do izby „władza”. A co wtedy?...

„Kurier Wileński” nr 136, 19.05.1938 r., s. 6

Lecz gospodarze, a szczególnie gospodyni, nalegali. W tych warunkach opuszczenie izby przed końcem poczęstunku wyglądałoby na ucieczkę i wzbudziłoby podejrzenia. Jednocześnie pokusa wypicia czegoś gorącego była zbyt wielka. Zdecydowaliśmy się zostać. To było ryzyko. Jak wielkie było to ryzyko – wkrótce się przekonaliśmy.

Woda ani rusz nie chciała się zagotować, nasz pobyt przedłużał się. Niepokoiliśmy się, nie dając jednak tego poznać po sobie i prowadząc ożywioną rozmowę o warunkach życia i pracy tutejszej ludności i o naszym pobycie w tundrze.

Opowiadałem o wrażeniach z tundry, o wielkiej ilości napotkanego po drodze dzikiego ptactwa – pardwach, kaczkach, gęsiach, łabędziach. Mówiliśmy o reniferach. To ostatnie bardzo zaciekawiło gospodarzy. Wypytywali, czy zbierają się już w stada, gdzie i w jakiej ilości je widzieliśmy. Pytania te miały dla nich znaczenie praktyczne. Na tutejsze warunki była już późna, chociaż ciepła, jesień. We wrześniu już bardzo często pada tutaj śnieg i nie schodzi aż do wiosny. Od wiosny renifery wyruszają na pastwisko do tundry i pozostają tam do jesieni. Na jesieni cała ludność męska wychodzi je zganiać. Gospodarz lub członek jego rodziny podchodzi do napotkanego w tundrze stada reniferów. Spędza z nimi dzień lub dwa. Renifery poznają go i ruszają wślad za nim. Po drodze przyłączają się do stada napotkane pojedyncze sztuki i stada. „W ten sposób wędrujemy, póki nie zbierzemy reniferów – opowiadał gospodarz – a wtedy prowadzimy je do domu”.

– Jak to? – zdziwiłem się. – Czyż one nie uciekają, nie przyłączają się do stad dzikich reniferów?

– Nie – odparł gospodarz – one nas znają. A reniferów dzikich wcale nie ma. Tutaj tylko nasze, oswojone.

Dziwne mi się to wydało – na tak olbrzymiej przestrzeni dzikiej, bezludnej tundry nie ma dzikich reniferów. Nie mniej dziwne wydało się to, że renifery, pozostawione same sobie, koczując przez całe lato po tundrze, nie dziczeją! Reniferów podczas naszej podróży spotkaliśmy wielką liczbę, lecz pastuchów przy nich nie widzieliśmy.

Podczas tej rozmowy wzrok mój padł na środek izby, gdzie w pobliżu kołyski siedziała kobieta i coś majstrowała ze skóry.

– Co się tam robi? – spytałem gospodynię.

– Szyjemy buty ze skóry reniferowej dla naszych mężczyzn. W takich bucikach, jak nasze, daleko nie przejdziesz, a oni muszą dużo chodzić po tundrze. Jak wyruszają nasi mężczyźni do tundry, nie wracają całymi miesiącami. Dopóki zapas prowiantów nie skończy się, siedzą, gdy skończy się – nie ma rady, znów wracają do chaty po jedzenie. Ot tak, jak wy…

Przy ostatnich słowach, wypowiedzianych nieco przyciszonym głosem, gospodyni przenikliwie spojrzała na nas. Jednak pozostaliśmy „niewzruszeni”, nie zdradzając się bynajmniej, że ostatnie słowa mogą mieć jakiekolwiek do nas zastosowanie.

Co oznaczały te słowa? Czy chciała z reakcji naszej upewnić się w swych podejrzeniach? Czy może już przeniknęła naszą tajemnicę i chciała nam to dać do zrozumienia oraz wyrazić w ten sposób współczucie i sympatię?

Takie myśli przelatywały mi przez głowę, gdy zewnętrznie zachowywałem całkowity spokój, oczekując ze słów dalszych rozwiązania tej zagadki.

Rozwiązania się nie doczekałem. W tej chwili wszedł do izby gospodarz, który niedawno się oddalił, i stanął między nami a swą żoną. Rozmowa urwała się.

– Co to za ozdoby? – spytałem, gdy przysiadł się do mnie.

– Są to kły zabitych przeze mnie niedźwiedzi – odrzekł.

– A czyż są tu niedźwiedzie?

– O, ile jeszcze! Tylko bieda, że nie ma czym polować. GPU wszystkie strzelby zabrało. Na broń nie dają pozwolenia. A ile szkody nam przynoszą niedźwiedzie! Ot niedawno niedźwiedź cielę sąsiada rozszarpał. No, i nie ma rady, gdy nie ma broni. Z pustymi rękami na niedźwiedzia nie pójdziesz. A dzikiego ptactwa teraz ile! Przecież widzieliście chyba?

– Tak – powiadam – nie tylko widziałem, lecz gołą ręką złapałem młodą pardwę.

Gospodarz uśmiechnął się.

„Kurier Wileński" nr 137, 20.05.1938 r., s. 6

Dlaczego GPU nie daje pozwolenia na broń i odebrało tę, którą miejscowi ludzie posiadali – już nie pytałem. Sam fakt mówił za siebie najwymowniej. Władze sowieckie tak nie ufają miejscowej ludności, że temu plemieniu, hodującemu renifery, trudniącemu się rybołówstwem i polowaniem, odebrano wszystką broń, pozbawiając go jednej z trzech podstaw życia.

Świadczyło to nader wymownie o wzajemnych stosunkach ludności i władz.

Zainteresowała mnie również i druga podstawa bytu – hodowla reniferów.

Jeszcze w Murmańsku słyszałem, iż tam, gdzie poprzednio było dwa tysiące reniferów, teraz pozostało dwieście. Chciałem sprawdzić te informacje.

Jednakże gospodarz na ten temat stał się dziwnie małomówny. Powiedział mi tylko, iż reniferów, przypadających na jego gospodarkę, liczy się w kołchozie 45. O znaczeniu tej cyfry i o tym, ile mieli przedtem, nie powiedział ani słowa. W ogóle o kołchozie i kolektywizacji milczał po prostu, albo dawał takie odpowiedzi, które nieobeznanemu z miejscowymi stosunkami człowiekowi nie mogły absolutnie nic powiedzieć.

Ta małomówność była nadzwyczaj charakterystyczna i znacząca, gdyż w Sowietach nieznajomym ludziom mówi się tylko o tym co dobre, albo… nic.

Dla żartu tylko zadałem pytanie, czy też zdarzały się u nich w czasie kolektywizacji deportacje. Tu, na dalekiej północy ZSSR, w tundrze, na polarnej pustyni, pytanie to, zdawało mi się, ma humorystyczny charakter.

– Były… i nie jednego… z całą rodziną – odrzekł mi na to gospodarz stłumionym głosem, jakim zwykli mówić prymitywni ludzie o nieboszczykach lub zjawiskach, o których nie powinno się na głos wspominać, by nie sprowadzić biedy i nieszczęść. Po tym tonie i twarzy jego można było sądzić, jakie uczucie grozy wywołały w nim te wspomnienia.

I nie dziw. Nie surowa przyroda przejmowała grozą mieszkańców tundry, lecz los rodaków, pozbawionych z rodzinami podstawy egzystencji, krów i reniferów. Jaki los czekał ich w tundrach Uralu i Syberii?

Nie dziwiłem się mu doprawdy.

Rozmowę naszą przerwało wejście jakiejś młodej dziewczyny. Ubrana była na wzór wszystkich tutejszych kobiet, może tylko trochę lepiej, lecz wyróżniała się inteligentnym wyrazem twarzy i przenikliwością spojrzenia. Podeszła do stołu i bezceremonialnie przysiadła do nas, z punktu zasypując nas pytaniami.

I znów zaczęło się od początku:

– Kim jesteście?

– Badacze geologowie – odpowiedziała żona takim tonem, jakby odpowiadała na to pytanie po raz pierwszy.

– Złota i żelaza szukamy – dodałem, chcąc być z jednej strony w zgodzie z geologią, z drugiej zaś – w zgodzie z samym sobą, nie zaprzeczając temu, co oświadczyłem na samym początku. „Złoto i żelazo" – odpowiadało obydwu warunkom.

Zaledwie zdążyłem to powiedzieć, jak żona, nie dając przyjść do słowa naszej rozmówczyni, pouczającym i poważnym tonem objaśniła:

– Gdy znajdziemy żelazo, będziecie mieli kosy. Po tych słowach dziewczyna obdarzyła żonę uśmiechem porozumienia i aprobaty. Ten inteligentny błysk uśmiechu nie pozostawił mi żadnej wątpliwości co do tego, z kim mamy do czynienia. Była to nauczycielka ludowa, z którą spotkania tak chcieliśmy uniknąć!

Zapewne we wsi dowiedziała się, że przybyli jakiś mężczyzna i kobieta, podający się za geologów, i zdecydowała z tytułu swojej pracy społecznej i z obowiązku agenta GPU powitać nas i uprzyjemnić czas rozmową.

Wypowiedź mojej żony została przez nią zrozumiana jako popularyzacja sowieckiej geologii i usposobiła ją do nas korzystnie. Wzrok jej stał się mniej badawczy. Po zadaniu jeszcze kilku pytań usunęła się w głąb izby, jednakże nie przestając nas obserwować.

Do chaty zagladali wciąż jeden za drugim jacyś mężczyźni, kobiety. Wiadomość o naszym przybyciu rozeszła się już po wsi. Wchodząc do izby, nieoczekiwanie zwracali się do nas w niezrozumiałym języku i dopiero, widząc nasze zdziwienie, przechodzili na język rosyjski. Zapewne sprawdzano naszą znajomośći języka fińskiego.

Po każdym skrzypnięciu drzwi czuliśmy się nieswojo. Lada chwila mógł przyjść ktoś z tutejszej władzy – prezes, sekretarz lub wprost członek sielsowietu, nie mówiąc już o uniformowanych agentach GPU, i zapytać o… dokumenty.

Herbata uporczywie nie chciała się zagotować. My zaś siedzieliśmy jak na gorących węglach.

Jednakże doczekaliśmy się. Gospodyni podsunęła cukiernicę, nalała herbaty, córka znów podała rybę, znów pojawiły się na stole pajdy chleba. Gospodyni nie omieszkała przy tym wyrazić swoich żalów z powodu niedostatecznej racji żywnościowej.

Z niezbyt gościnnym wyrazem twarzy obdzielała nas chlebem. Przy nowych utyskiwaniach gosposi na brak chleba, żona zrobiła uwagę, że wszak ziemniaki doskonale zastępują chleb i w ogóle ratują sytuację.

– Tak – odpowiedziała gospodyni – ale gdyby one były! Przecież je przywożą…

– A czyż u was tutaj nie rodzą? W muzeum w Murmańsku pokazywano nam ogórki i nawet pomidory, które wyhodowano w tutejszych stronach.

„Kurier Wileński" nr 138, 21.05.1938 r., s. 6

– Ziemniaki może by i wyrosły. Lecz my nie umiemy sadzić. Ot, w roku ubiegłym posadziliśmy. Wyrosły, zakwitły, zebraliśmy nasiona i nic z nich nie wyszło.

Żona z właściwym jej ożywieniem zaczęła opowiadać o uprawie ziemniaków, co i jak należy czynić.

Gospodyni, słuchając, nie tylko rozpływała się w uśmiechach pełnych wdzięczności, lecz ze szczerego serca krajała jedną pajdę chleba za drugą, napełniając nimi całą misę. W tym czasie nauczycielka, szerzycielka kultury, stała w głębi izby, nie spuszczając z nas swego podejrzliwego wzroku. Miała pod dostatkiem czasu i energii, aby, dowiedziawszy się o naszym przybyciu, przyjść tutaj, wybadać nas, wypełnić swe obowiązku agenta GPU, stercząc tu nie wiadomo jak długo, lecz brak jej było czasu i chęci, by nauczyć swych wioskowych sąsiadów, jak sadzić i pielęgnować kartofle, jak wybrnąć z beznadziejnej nędzy. Przykładna, klasowo czujna pracowniczka społeczna, „udarnica"! Bezduszna czynownica! Ileż jest ich takich na ziemi sowieckiej?!

Doczekawszy się nareszcie herbaty, chciwie zacząłem ją pić, nie oszczędzając cukru. Delektowałem się tym gorącym, słodkim, dawno nie widzianym napojem, który rozgrzewał nasze wnętrzności. Po przymusowej kąpieli i zimnym mleku była to rozkosz prawdziwa. Piłem prędzej od żony. Podczas gdy ona kończyła drugą szklankę herbaty, ja już dopiłem trzecią.

Podczas tej libacji nowi nieznajomi wchodzili i wychodzili z izby, witając się z nami. Przy każdym skrzypnięciu drzwi oczekiwaliśmy, że ujrzymy agenta GPU lub geologa, przybyłego powitać swych nowych, niegrzecznych kolegów. W każdym witającym nas chłopie w pierwszej chwili widzieliśmy przedstawiciela sielsowietu. Barometr nastroju – wyraz twarzy naszych gospodarzy – z uprzejmego stawał się stopniowo ponury.

Wstaliśmy od stołu i podziękowaliśmy gospodarzom za przyjęcie. Przy pożegnaniu ze słowami: „Niech to będzie dla dzieci na cukierki", położyłem na stół jeszcze jednego rubla. Żwawo narzuciwszy na plecy torby podróżne, opuściliśmy izbę. Stojąca na swym miejscu, w głębi izby nauczycielka chciała coś rzec, lecz my, udając że nie zauważyliśmy tego, wyszliśmy na podwórko.

Szybkim krokiem skierowaliśmy się ku skrajowi lasu. Gdyśmy już byli u otaczającego domostwo płotu, nauczycielka, która wyszła w ślad za nami, zawołała:

– Nie w tę stronę idziecie!

– Idziemy w góry! – odrzekłem.

Z tymi słowami przekroczyliśmy ogrodzenie i byliśmy już w lesie.

Zamykamy

Teraz z bijącym sercem, z zapasem nowych sił, pędziliśmy w góry z jedną tylko myślą – jak najszybciej, jak najdalej od wioski! Po stromym wzniesieniu drapaliśmy się rękami, czepiając się brzozowych krzewów.

Obfite śniadanie, dawno nie widziana gorąca, słodka herbata, parogodzinny odpoczynek w ciepłej izbie i strach, że nas mogą zatrzymać, wszystko to potroiło nasze siły, uskrzydliło nas. Biegiem prawie wdrapywaliśmy się na stromą górę. Byliśmy rzeczywiście podobni do ludzi salwujących się ucieczką. Gdyby teraz ktokolwiek nas dojrzał, nie miałby żadnej wątpliwości.

Lecz zaledwie zdążyliśmy dotrzeć do pokrytej brzozami polany, usłyszeliśmy kobiece głosy. Dzięki temu, że posuwaliśmy się w milczeniu, starając się zachować jak największą ciszę, dowiadywaliśmy się o bliskiej obecności ludzi prędzej, niż ci zdążyli nas zauważyć. Orientując się według ich głosów, staraliśmy się ich wyminąć niepostrzeżenie.

Około 15 minut posuwaliśmy się w ten sposób w milczeniu, gdy wtem z prawej strony usłyszeliśmy znowu głosy ludzkie. Stąpając jeszcze ciszej, boso, rzuciliśmy się przeciwległą stronę.

Cdn ■

Калісь пісалі

Ад калі стаў мяне цікавіць Францішак Аляхновіч (1883-1944) – а было гэта ў пачатку 90-ых гадоў мінулага XX стагодзьдзя – сабіраю ўсё, што адносіцца да яго жыцьця і творчасьці. Найбольшым адкрыцьцём для мяне былі яго сыны Юры і Казімір, якіх знайшла крыху нечакана для сябе ў 2003 г. Зараз ужо няма іх сярод жывых, але сяброўства з імі перайшло на іх дзяцей і ўнукаў, якія цікавяцца сваім дзедам і прадзедам і час ад часу натхняюць і мяне да новых пошукаў. Тое, што зараз прапаную, не ёсьць новай знаходкай. Гэта публікаваныя двойчы (а магчыма і больш разоў) успаміны Францішка Аляхновіча, якія даслаў ён у лісьце Кастусю Езавітаву ў ліпені 1943 г. Кастусь Езавітаў (1893-1946) жыў у Рызе яшчэ з 1919 г., а са студзеня 1942 г. рэдагаваў там часопіс «Новы Шлях», у якім апублікаваў м.інш. успаміны Францішка Аляхновіча (пад псэўданімам Юр. Монвід – у №№ 2-8) з 1940-1941 гг. «Страшны год» і абшырны – пасьмяротны ўжо – біяграфічны артыкул пра драматурга (№ 6). Кастусь Езавітаў намагаўся як мага больш сабраць зьвестак пра выдатнага драматурга ад яго самога. Адказам на яго намаганьні быў ліст, які чамусьці Кастусь Езавітаў апублікаваў не ў «Новым Шляху» (выходзіў да траўня 1944 г.), але ў беластоцкай «Новай Дарозе», якую рэдагаваў Хведар Ільяшэвіч. Быў ён надрукаваны зараз-жа пасьля забойства Францішка Аляхновіча (3 сакавіка 1944 г.) у красавіку 1944 г. у №№ 14-16. Чаму не ў Рызе, ці не ў «Беларускім Голасе», якога рэдактарам да забойства быў драматург, ці не ў «Беларускай Газэце» ў Менску? Праўда, усе гэтыя выданьні з сабой вельмі супрацоўнічалі, што бачна на іх

старонках. Але няхай гэта пакуль застаецца загадкай, магчыма час паспрыяе яе разгадцы.

Гэтыя нумары «Новай Дарогі» чамусьці захаваліся ў Бібліятэцы Літоўскай Акадэміі Навук у Вільні, цікава, што са штампам Weissruthenishe Komitee in Bialystok. Зрабіўшы копіі з іх даўным-даўно – у сувязі з пісаньнем біяграфіі Хведара Ільяшэвіча – мне нават не прыйшла ў галаву думка, што гэты ліст Францішка Аляхновіча Кастусу Езавітаву можа розьніцца ад тога, што апублікаваны ў выдадзеных творах драматурга ў Менску пасьля 1990-ых гг. Зараз няма ў мяне менскага выданьня з 1994 г. «У капцюрох ГПУ», куды трапіў гэты ліст, але ёсьць «Выбраныя творы» Францішка Аляхновіча (Мінск «Беларускі кнігазбор» 2005). Там на сс. 391-400 зьмешчана «Замест аўтабіяграфіі – крыху ўспамінаў».У каментарах на с. 529 можна даведацца, што друкуюцца яны «паводле выд.: Аляхновіч Ф. У капцюрох ГПУ. Мн., 1994», а «упершыню – газ. «Новая Дарога» (1943, № 40, 23 кастр.)». Як не шукала, але дасюль нідзе не знаходжу № 40 гэтай газэты, якая зараз зьяўляецца сапраўдным рарытэтам і на тэрыторыі Польшчы не захавалася ні ў адной бібліятэцы, хаця выдавалася яе больш як 30 тысяч экзэмпляраў. Пераглядаючы за тое, тыя нумары, якія захаваліся ў прыватных калекцыях, ды ў Менску ці Вільні, аказалася, што гэты ліст быў надрукаваны толькі пасьля сьмерці Францішка Аляхновіча. Дарэчы, наўрад ці сам аўтар дазволіў-бы яго публікаваць пры жыцьці. Нечаканая сьмерць стала нагодай да публікацыі. Зірнуўшы ў «Новую Дарогу», а заадно і ў «Выбраныя творы», маю дасьледчыцкую ўвагу зьвярнула неадэкватнасьць загалоўкаў – у «Новай Дарозе» «Францішак Аляхновіч – сам аб сабе». Пасьля ліст да Кастуся Езавітава, а пасьля «Замест біяграфіі – крыху успамінаў». Разумею, што біяграфія амаль тое-ж што і аўтабіяграфія, асабліва пісаная самім аўтарам, але...

Пачала параўноўваць абедзьве публікаці – быццам бы тыя самы, але не такія самыя. Паколькі я ў стане ўспрымаць выкіданьне мяккіх знакаў з арыгінальных тэкстаў, то цяжка пагадзіцца, калі рэдактары мяняюць словы, ці перарабляюць іх гучаньне на сучасны лад, напр. «пагаворкі» на «прымаўкі», «кляса» на «клас», «граніцы» на «межы», «мамэнт» на «момант», «повад» на «прычыну», «вуяшэк» на «дзядзька», «аказыю» на «нагоду», «звозчыцкіх» на «рамізніцкіх», «канура» на «дзіра», «ня» на «не», «сягоньня» на «сёння», «псэўданім» на «мянушка», «прапасьці» на «загінуць» і г.д. Гэтых правак, пры тым стылістычных, ёсьць так шмат, што калярытная мова Францішка Аляхновіча згубілася пад нечыяй рэдактарскай рукой. Дарэчы іншыя тэксты Францішка Аляхновіча маюць падобныя грахі, але ўсёж такі крыху іх там менш.

Перачытаўшы дакладна абодва тэксты, аказалася, што ў менскіх выданьнях чамусьці выкінуты каментар Кастуся Езавітава, які знайшоўся пад апублікаваным лістам Францішка Аляхновіча. Ён шмат гаворыць і пра Францішка Аляхновіча і пра абставіны яго загадкавай сьмерці, пра якія Кастусь Езавітаў мог ведаць непасрэдна ад жонкі Францішка Аляхновіча, калі такое адважыўся напісаць 15 дзён пасьля забойства драматурга ў «Новую Дарогу». Дзеля «смакавітасьці» і арыгінальнасьці мовы Францішка Аляхновіча, а таксама як напамін пра беластоцкую газэту і клясыка беларускай драматургіі прапаную чытачам гэты перадрук.

Лена Глагоўская

Францішак Аляхновіч – сам аб сабе

У красавіку 1942 году, амаль за цэлы год да 60-годзьдзя Францішка Аляхновіча, зьвярнуўся я да яго з просьбай, каб ён напісаў для беларускае прэсы сваю аўтабіяграфію. Дзеля таго, што біяграфічных вестак аб Ф. Аляхновічу ў нашай літаратуры было мала, апублікаваньне аўтабіяграфіі пісьменьніка, напярэдадні ягонага 60-гадовага юбілею, было-б дужа пажаданым і карысным. Аднак, Ф. Аляхновіч ніяк ня мог узяцца за напісаньне сваёй аўтабіяграфіі і лістом ад 1-га траўня 1942 году паведаміў мяне, што яму «пакуль-што цяжка пісаць аб сабе».

Калі я гэткім ягоным адказам не задаволіўся і ў новым настойлівым сваім пісьме давёў яму, што ў жыцьці кожнага чалавека ёсьць шмат гэткіх момантаў, аб якіх ніводзін біограф ня мае ніякае магчымасьці даведацца, калі аб гэтых момантах не раскажа сам чалавек, які іх перажыў, дык Ф. Аляхновіч 15-га ліпеня 1942 году прыслаў мне вялікі друкаваны лацінкай на пішучай машынцы ліст-успаміны, асьвятліў некалькі момантаў з свайго багатага рознымі падзеямі жыцьця. Гэты ліст меў агульны назоў – «Замест аўтабіяграфіі – крыху успамінаў». На пачатку ліста зварот да мяне і некалькі уступных паясьняльных радкоў, а далей на 8 вялікіх аркушах было 12 кароценькіх успамінаў-малюначкаў, з якіх першыя 6 апісваюць здарэньні 1902-1903 гадоў, 7-мы малюначак з 1910-1913 гадоў, 8-мы, 9-ты, 10-ты і 11-ты малюначак прысьвечаны 1922 году, а апошні 12-ты нарыс апавядае аб 1940 годзе.

Гэтыя ўспаміны я выкарыстаў для складаньня біяграфіі Ф. Аляхновіча, напісаньне якой, аднак, на вялікі мой жаль, пасоўвалася наперад дужа марудна і заняла ўвесь канец 1942 году і большую палову 1943 году, бо толькі пасьля шматлікіх прыпамінаньняў атрымліваў я ад перагружанага працай пісьменьніка патрэбныя мне дакладныя весткі аб яго бацьках і дзеду ды аб жыцьці самога пісьменьніка. Толькі 18 -га верасьня 1943

году змог я, нарэшце, закончыць ягоную біяграфію і, пасьля передруку яе на машынцы, пераслаць яму на перагляд, каб унікнуць якіх-колечы недакладнасьцяў. Перагледжаная Ф. Аляхновічам ягоная біяграфія была 24-га кастрычніка 1943 году надрукавана ў № 40 беластоцкае газэты «Новая Дарога», а сёлета ў № 6 (42) часопісу «Новы Шлях», зьявілася яна з некаторымі папраўкамі і скарачэньнямі.

Пасьля дачаснае трагічнае сьмерці Францішка Алекна-Аляхновіча, якая сталася ад рукі забойцы-тэрарыста 3-га сакавіка 1944 году, перагледзеў я яшчэ раз ягонае пісьмо-ўспаміны ад 15-га ліпеня 1943 году і прышоў да перакананьня, што цяпер якраз начасе даць яго ў друк, як дадатак да ягонае біяграфіі. Дужа цікавае пісьмо гэтае зьмяшчаецца ніжэй цалкам, у тым выглядзе, як яно было да мяне прыслана Ф. Аляхновічам у 1942 годзе.

Замест біяграфіі – крыху ўспамінаў.

Паважаны Спадар Езавітаў!

Просіце мяне, каб я напісаў сваю аўтабіяграфію. Трудна гэта, або, проста кажучы, нялоўка. Вярнуўшыся з Салаўкоў, я ўжо гэтулькі пісаў аб сабе і аб сваіх пержываньнях, што ўжо, далібог, нязручна яшчэ больш пісаць аб сабе.

Адзін з маіх прыяцеляў казаў мне раз:

– Ты, Франук, любіш стукнуцца лобам аб сьценку, а пасьля дзівуешся, што выскачыў сіняк і баліць...

Можа ён добра казаў. Шмат разоў я «стукаўся» лобам аб сьценку. Наймацней стукнуўся, калі паехаў у Менск «будаваць беларускі дом».

Але лёс, аднак, мяне шкадуе. Ужо, здаецца, ніякага ратунку няма, ужо прапаў чалавек – ажно раптам прыходзіць вызваленьне.

І выходзіць паводле пагаворкі: няма такога зла, якое ня кончыцца дабром.

Дык вось, калі хочаце, напішу тут Вам крыху маіх трагі-камічных перажываньняў, якія на маё шчасьце добра, аднак, усе канчаліся.

Калі што з гэтага можаце выкарыстаць – карыстайце.

І. У гімназіі.

Вучыўся я блага. Яшчэ да 3-й клясы, пакуль меў рэпэтытараў, дык сяк-так, але ў 4-й і 5-й клясах ужо зусім дрэнна.

Сыпаліся «двойкі» і «едзініцы», запісывалі мяне ў «штрафны журнал» за «упартае невыкананьне лекцый» – і, урэшце, прасядзеўшы па 2 гады ў чацвертай і пятай клясе, я быў выкінуты з гімназіі за дрэнныя «ўсьпехі».

Запісаўся ў хіміка-тэхнічную школу. Але і тут – тое самае...

А ў галаве ўжо даўно сядзела думка: ехаць у драматычную школу. Калі ўжо гэтая думка ўлезе ў галаву, дык і калом яе ня выб'еш. Праўда, калом ніхто ня выбіваў, але затое ўсе – і сваякі, і прыяцелі – казалі адно: раней трэба скончыць хімічную школу, а пасьля ўжо думаць аб сцэне.

Але-ж на які чорт мне гэтая хімія! Хімічныя формулы ня лезуць у галаву...

Але куды ехаць? Мяне цягнула на захад. Заграніцу. У Кракаў...

2. Без заграпічнага пашпарту.

Заграпічны пашпарт каштуе 25 залатых рублёў. А ў мяне ў кішані ўсяго 15 рублёў. Я ведаў, што праз граніцу людзі прабіраюцца неяк без пашпарту. У Кракаве былі мае прыяцелі, якія раней за мяне выехалі таксама без пашпарту.

Я сеў на цягнік – і паехаў.

Ёсьць сцэнічны абразок Г. Запольскай у адным акце, пад назовам «У Горнай Дамброве». Гэтая Дамброва – прыгранічнае мястэчка, дзе ёсьць каменавугольныя шахты. Я, ня доўга думаючы, паехаў у гэтую Дамброву.

Раніца. Малое, пакрытае вугольным пылам мястэчка. Па драцяных паветравых лініях снуюць вагончыкі. Рабочы люд ідзе да працы.

А я з чамаданчыкам у руцэ іду... ня ведаю куды.

Адзін у чужой старонцы, ніводнай душы знаёмай.

Па дарозе шынок. Думаю: зайду, абдумаю сваё палажэньне, можа з кім параюся.

У шынку шмат народу. Работнікі п'юць гарэлку, закусваюць, адны сьпяшаюцца да працы, іншыя ідуць з працы.

Я сяджу пры сваім століку пры бутэльцы піва і ня ведаю, што рабіць. Нарэшце злавіўшы мамэнт, калі народу было мала, я падышоў да гаспадара і пытаюся:

– Скажэце, як-бы мне прабрацца заграніцу?

Гаспадар паглядзеў на мяне ўважна, але ня надта зьдзівіўся. Падумаў хвіліну і кажа:

– Пасядзеце яшчэ крыху, пачакайце. Хутка павінен сюды прыйсьці адзін мой знаёмы. Магчыма, што ён гэта вам наладзіць.

Чакаю. У шынку ўжо парадзела. Навакол мяне ўжо пустыя столікі. Дзьверы адчыняюцца. Уваходзіць нейкі чалавек. Вопратка зьнішчана. Твар п'яніцы. Нямалады ўжо. Гадоў пад пяцьдзесят.

Гаспадар, паказваючы на мяне, нешта яму шапоча. Незнаёмы глянуў у мой бок. Кіўнуў мне пальцам. Я падыходжу.

– Вось гэты пан мог-бы вам дапамагчы. Пазнаёмцеся, пагутарце.

Знаёмімся:

– Аляхновіч...

– Кулеша...

– Дык, калі ласка, сядзем... Прашу да майго століка...

– З прыемнасьцю...

– Можа вып'ем па чарцы?
– Калі ласка.
– Чым закусім? Можа гарачыя сардэлькі?
– Не зашкодзіць.
Выпілі. Закусілі. Пачалі гаварыць аб справе.
– Чаго вы едзеце?
Хачу запісацца ў драматычную школу ў Кракаве.

«Новая Дарога», № 14(100), 2.04.1944 г., с. 3

Чаму-ж без заграпічнага пашпарту?
– Ня маю грошаў на пашпарт.
Выпілі яшчэ. Закусілі. Пачала вытварацца між намі атмасфэра даверу і сымпатыі.
– Гм... Добра – кажа мой знаёмы – я магу вам даць свой пропуск, але трэба тры дні пачакаць. Праз тры дні толькі ў гміне выдадуць мне.
– Ох, толькі праз тры дні!
– Але. Бо, бачыце, мы, прыгранічныя жыхары маем права чатыры разы ў год браць пропуск на выезд заграніцу. Як я браў апошні раз, яшчэ не прайшло тры месяцы. Трэба пачакаць. Пачакайце. Тут я вам падракамандую недарагі заездны двор.
– Але мне трудна чакаць. Я маю вельмі мала грошай... А колькі вам трэба заплаціць?
–- Ну, калі ў вас мала грошай... Ну, неяк згаворымся... Ведаеце што: давайце, вып'ем яшчэ па чарцы!
Я ўздыхнуў і заказаў яшчэ гарэлкі і гарачых сардэлькаў.

«Дзядзька» і «пляменьнік»

– Бачу, што вы добры хлапец – кажа пан Кулеша – я ўсё наладжу. Будзе добра. Цяпер пойдзем да маіх прыяцеляў. Яны ведаюць, што я маю ў Варшаве пляменьніка... Вы скажаце, што вы мой пляменьнік. Там мы з гэтага поваду яшчэ вып'ем...
І стары п'яніца хітра мне падмігнуў.
Пашлі. Прыйшлі ў хату нейкага шаўца.
– Ведаеце што? – пачаў весела мой праваднік – вось неспадзеўка! Сягоньня прыехаў з Варшавы мой пляменьнік... Гэтульки часу! Ужо больш за дзесяць гадоў, як я яго ня бачыў. Вырас хлопец, праўда? Я-б яго і не спазнаў... А як падобны да маёй сястры! Цяпер хоча ехаць у Кракаў, у драматычную школу... Франусь! знаёмся з маімі прыяцелямі, гэта добрыя людзі...
З гэтай радасьці паявілася гарэлка, закуска, піва. Спачатку мне было нязручна ў гэтай ролі «пляменьніка», але хутка прызвычаіўся, называў пана Кулешу «вуяшэк», расказваў нешта аб жыцьці ягонай сястры, якой я ніколі ў вочы ня бачыў.
Запрасілі мяне на начлег.
Назаўтра зьявіўся Кулеша, ізноў забраў мяне з сабой да іншых сваіх знаёмых – і гэтак прайшлі тры дні.
Калі я прыпомніў яму аб заграпічным пропуску, ён пачаў намаўляць мяне, каб я яшчэ застаўся ў Дамброве, але мне было гэтага даволі. Кулеша, дзякуючы маёй прысутнасьці, меў аказыю адведаць сваіх знаёмых і напівацца.
Чалавек, які ня сее, ня жне, а жыве на Божым сьвеце нейкім цудам.
Усюды ёсьць свае Шылы!
Нарэшце, ёсьць «пшэпустка». У ёй напісана: Андрэй Кулеша, 45 гадоў. Мой новы знаёмы прыяцель дрыжачай рукой перарабляе чацьвёрку на двойку. Выходзіць 25 гадоў. Мне ўсяго толькі 19. Але ўсё-ж больш праўдападобна. Бо я – 19 гадовы хлапчук – на 45 гадовага чалавека ніяк ня выглядаў.
Кулеша праводзіў мяне на вагзал. Мы праз гэтыя дні ўжо зжыліся з сабой, што я сапраўды ўжо меў да яго сэнтымэнт блізкі да таго, які адчувае пляменьнік да свайго дзядзькі. Абодва мы ўвайшлі ў свае ролі.
На вакзале сардэчна пацалаваліся на разьвітаньне.
– Памятуй, Франусь! – казаў Кулеша перад самым адыходам цягніка: – як прыедзеш у Кракаў, затрымайся ў «Хрысьціянскай Гасподзе» на Клепажу. Там танна і добра.

У Кракаве

Кракаў. Вечар. На вуліцах гараць ліхтарні. Ужо я разьмяняў астаўшыеся ў мяне рублі (ня шмат!) на аўстрыйскія кроны. Стаю з сваім чамаданчыкам у руцэ і бязрадна гляджу не вуліцу. Стаіць рад звозчыцкіх карэтак. Я клічу:
– Дорожкаж!
Маўчаньне.
Яшчэ раз:
– Дорожкаж!
Нехта мне кажа:
– Вы, мусіць, прыехалі з заграніцы. У нас клічуць: фіякер...
Клічу:
– Фіякер!
Адзін з возьнікаў сьцебануў пугай, пад'ехаў.
Я даю адрас:
– «Хрысьціянская Гаспода» на Клепажу.
Адзін – два павароты і карэтка затрымалася.
Чаму-ж я не пайшоў пехатой! Гэта-ж так было блізка!..

У гасподзе

У начлежцы, у даволі вялізным пакоі восем, ці болей ложкаў. На адным з іх лёг я.
Уначы нехта мяне тузае:
– Вашы дакументы?
Нада мной стаіць нейкі ягомасьць у чорным паліце, у круглым цьвёрдым капялюшы. На румяным твары тырчаць вусы.
– Вашы дакументы?
Выцягваю свой расейскі пашпарт.

– Як вы пераехалі граніцу:

Я паказываю пропуск.

Паліцэйскі агент хаця ня ўмее чытаць па-расейску, але гэтулькі разьбіраецца, што бачыць: на пашпарце прозьвішча – Аляхновіч, а на пропуску – Кулеша.

– Тут розныя прозьвішчы! Што гэта значыць?

– Вельмі проста – кажу шчыра: – я прыехаў з чужым пропускам.

– Чаму ня маеце заграмічнага пашпарту?

– Бо дорага каштуе.

– З якой мэтай прыехалі?

– Запісацца ў драматычную школу.

– Апранайцеся. Пойдзем!

– За каго вы мяне прыймаеце? Вы мусіць думаеце, што я нейкі злачынца?

– О, у мяне добрае вока. Я бачу, што вы за птушка! Апранайцеся хутчэй!

І мы пайшлі. Ужо ноч. Вуліцы пустыя. Дзе-ні-дзе сьвецяцца вокны начной кавярні.

Першы раз у астрозе.

Адчынілася нейкая брама. Узялі мой чамаданчык. Забралі капялюш, палку, шэлькі. Упіхнулі ў нейкую закратаваную капуру, дзе на голых нарах спалі нейкія абарванцы...

Сумныя думкі. Вось як кончылася маё падарожжа! Я ў астрозе! Што цяпер будзе? Можа прыдзецца гэтак сядзець цэлыя гады?...

На другі дзень раніцай мяне паклікалі ў канцылярыю. Кароткія допыты: хто я? Чаго прыехаў? З чаго буду жыць?

Кажу, што маю матку ў Вільні, якая прышле мне грошы, як напішу свой адрыс.

Пераначаваўшы частку ночы у «Хрысьціянкай Гасподзе», частку ў вастрозе, я ўжо на волі...

Рэдактар на Лукішках.

1910-ты год. Я ўжо ў Вільні. Паезьдзіў пару гадоў з тэатрам па розных гарадох і зноў апынуўся ў сваім родным горадзе. Працую як рэпартэр у віленскіх газэтах. Пасьля выдаў свой тыднёвы гумарыстычны часапіс. Маю ўжо 26 гадоў.

Але за адзін артыкул улада зачыніла мой тыднёвік. Абвінавачваюць мяне у «стремлении к нистпроверженію существующего строя», у «возложении хулы на бесплотныя силы небесныя».

Чакаю, калі мяне паклічуць да сьледчага.

Прыйшла паперка, каб я заўтра зьявіўся. Ведаю, чым гэта пахне. У гэты самы дзень сядаю ў цягнік і еду ізноў у Аўстрыю. Але цяпер ужо не на Дамброву, але на Сасновец. Гэтаксама, як і першы раз, пераяжджаю я граніцу. Зноў працую на сцэне.

Працяг будзе

Komary na planie filmowym

W maju 1929 roku białowieskie opłotki obiegła wieść, że wkrótce ściągnie do Białowieży ekipa filmowa Józefa Lejtesa, która będzie tutaj realizować zdjęcia do filmu fabularnego. Pary z ust puścili urzędnicy miejscowej Dyrekcji Lasów Państwowych, do której przedstawiciele wytwórni filmowej zwrócili się z prośbą o udostępnienie na plan filmowy wybranych miejsc w Puszczy Białowieskiej. Film początkowo miał nosić tytuł „Wiosenne dni”, ale później zmieniono go na „Z dnia na dzień”. Oczywiście ówczesny dyrektor DLP Antoni Sym wyraził zgodę – to był przecież zaszczyt dla Białowieży, a jednocześnie jej reklama w całym kraju!



Reżyser Józef Lejtes. Źródło: „Kino Teatr” nr 14/1929

Podekscytowanie białowieżan mającym nastąpić wydarzeniem było zrozumiałe, gdyż dotąd nikt w Puszczy Białowieskiej filmów fabularnych nie realizował. Autochtoni wprawdzie pamiętali, że w czasach carskich były filmowane łowy Mikołaja II, a podczas wojny światowej Niemcy uwieczniali na taśmie filmowej ówczesną rzeczywistość, ale żeby normalny film, z udziałem aktorów… Tutaj tego jeszcze nie było!

Lejtes, nim przystąpił do kręcenia filmu, postarał się o dobór odpowiednich pracowników technicznych. Do zdjęć udało mu się pozyskać z Berlina znakomitego operatora Hansa Scheiba, twórcę głośnej „Nocy miłosnej skazańca”. Reży-

ser dołożył też wszelkich starań, aby skompletować najlepszy zespół aktorski. W roli głównej, Marusi Radziejowskiej, obsadzona została Irena Gawęcka, jedna z wybijających się polskich aktorek. Jej męża zagrał doskonały aktor charakterystyczny Wiesław Gawlikowski. Do roli Jerzego zaangażowano Adama Brodzisza – nowego amanta kina polskiego, wybranego drogą konkursu „Wieczoru Warszawskiego". Rolę Katii powierzono Marii Gorczyńskiej, sędziego wojskowego – Lechowi Owronowi, isprawnika – Lucjanowi Żurowskiemu. W filmie wystąpili także: popularny Jerzy Kobusz oraz komik Władysław Walter.

Scenariusz filmu „Z dnia na dzień" został oparty na pięknej, przejmującej i głośnej powieści Ferdynanda Goetla. Pisarz i reżyser wykroili z niego fragment (autor zgodził się na to bez żadnych oporów), stanowiący zamkniętą i zwartą w sobie całość. Powstał klasyczny dramat psychologiczny, którego tłem jest tragedia wielkiej wojny europejskiej. Dwaj polscy żołnierze, służący we wrogich armiach, spotykają się na pobojowisku. Obaj ranni próbują ze sobą walczyć, lecz w końcu ich zapiekłość przeradza się w przyjaźń. Jest to początek przygód, które ich czekają. Wplątana w nie będzie także żona jednego z głównych bohaterów.

Ekipa filmowa ściągnęła do Białowieży w drugiej połowie czerwca 1929 roku, tuż po zakończeniu trwających dwadzieścia dni zdjęć w atelier Kaden-Studio w Warszawie. Reżyser, wówczas niespełna 28-letni Józef Lejtes, miał już na swym koncie zrealizowany rok wcześniej, na podstawie scenariusza Jerzego Brauna, film pt. „Huragan". Była to opowieść o powstaniu styczniowym, wzorowana plastycznie na rysunkach Artura Grottgera. W roli głównej wystąpił Zbigniew Sawan – „król ekranów polskich", jak go nazwali uczestnicy plebiscytu dwutygodnika „Kino dla Wszystkich". Przy okazji wspomnijmy, że aktor ten w lecie 1931 roku odwiedził Białowieżę, by tutaj nieco wypocząć.

Zdjęcia do „Z dnia na dzień" kręcono na terenie Nadleśnictwa Jagiellońskiego, na Polanie Białowieskiej i w Parku Pałacowym w Białowieży. Pracę ekipy, wiadomo, obserwowała pilnie spora liczba gapiów.

Odtwórczyni głównej roli kobiecej, Irena Gawęcka, w wywiadzie dla poznańskiego „Nowego Kurjera" (nr 195/1929), wspominała: „Doznaliśmy tu bardzo miłego przyjęcia ze strony dyrektora dóbr, którym jest ojciec Igo Syma. Niezbyt gościnnie przyjęły mnie za to komary, których są tam olbrzymie ilości. Asystent reżysera chodził krok za krokiem za mną z butelką amoniaku w ręce. Zaledwie ukończono zdjęcie – odwracam się i jak na zawołanie wychodzi z krzaków mój „konsyliarz".

Wymieniony przez aktorkę Igo Sym był synem ówczesnego dyrektora DLP w Białowieży – Antoniego Syma i Austriaczki Julii Sepp. Wprawdzie towarzyszył ekipie Lejtesa, ale przed kamerą nie występował; przebywał wówczas u ojca na wypoczynku. Po ukończeniu prywatnej szkoły filmowej Wiktora Biegańskiego, zadebiutował w 1925 roku w filmie. Piękny, wysportowany, cieszył się powodzeniem u kobiet. W latach trzydziestych związał się z wywiadem niemieckim, a w czasie okupacji został konfidentem Gestapo. Wojskowy Sąd Specjalny ZWZ wydał na niego wyrok śmierci, który został wykonany 7 marca 1941 roku. Ojciec Iga nie dożył tego dramatu, zmarł w 1935 roku.

Józef Lejtes w swoim filmie wydzielił ważną rolę przyrodzie. W wywiadzie dla czasopisma „Kino dla Wszystkich" (nr 92/1929) wyjawił, że dominujący w filmie przekaz, jak kruchym gmachem jest ludzkie szczęście, chciał jeszcze pogłębić ukazaniem psychicznego kontaktu człowieka z przyrodą. Zadaniem przyrody w jego filmie było nie tylko pełnienie roli tła, miała ona stać się przede wszystkim pośrednikiem ludzkich namiętności, pomocnikiem, a czasem i zastępcą aktora.

„Właśnie z tego względu – mówił reżyser – przykładam niesłychaną wagę do zdjęć, które poczyniłem w puszczy Białowieskiej. Dzięki uprzejmości tamtejszych władz korzystałem na terenie Białowieży z nieograniczonej swobody w robieniu zdjęć. Materiał, jaki stamtąd przywio-



Scena walki z isprawnikiem. Od lewej: Lucjan Żurowski, Adam Brodzisz i Irena Gawęcka. Źródło: „Wielkopolska Ilustracja" nr 50/1929

złem, jest utrwaloną na taśmie apoteozą polskiej przyrody. Nawiasem muszę wspomnieć, że natrafiliśmy w Białowieży na nieprzewidzianego, a zaciętego wroga w postaci... komarów. Nie ma pan pojęcia, jakie męczarnie przechodziliśmy wszyscy. Najwięcej ucierpiała naturalnie płeć piękna w osobie p. Ireny Gawęckicj, która, czując niezliczone ukąszenia złośliwych bestyj, musiała jednocześnie grać zakochaną i rozmarzoną".

Po opuszczeniu Białowieży ekipa filmowa kręciła jeszcze sceny plenerowe w majątku Ruda na Polesiu, oddalonym około trzydzieści kilometrów od Brześcia n. Bugiem. Dużo czasu one nie zajęły, za to wryły się w pamięć aktorom i realizatorom. W czasie kręcenia sceny pościgu kozaków za parą kochanków wydarzył się wypadek, który omal nie zakończył się tragicznie. W pewnym momencie od linijki oderwało się koło. Pędzące konie z trudem udało się zatrzymać. Niewiele brakowało, aby pojazd uderzył o drzewo, albo o jadące przodem auto z reżyserem i operatorem. Zdarzało się też, że aktorzy zapadali po szyję w błotach, tak że trzeba było ich wyciągać za pomocą sznurów. No i te nieszczęsne komary – tu także ich nie brakowało. Były dni, kiedy musiano przerywać zdjęcia, bo cały zespół chodził opuchnięty i obwiązany. Statyści ratowali się wódką, aktorzy bardziej cenili amoniak, którego podczas realizacji zdjęć w plenerze zużyto niesłychaną ilość.

Film „Z dnia na dzień" miał premierę 25 października 1929 roku. Demonstrowany był jednocześnie w następujących miastach: Warszawa (kino „Pan" i „Capitol"), Lwów („Kopernik", „Marysieńka"), Kraków („Uciecha", „Wanda"), Katowice („Rialto"), Bydgoszcz („Cristal"), Poznań („Słońce"), Lublin („Corso"), Sosnowiec („Zagłębie"), Białystok („Modern"), Wilno („Hollywood"). Nie wiemy natomiast, czy film był pokazywany w miejscach, gdzie zostały zrealizowane sceny plenerowe. W Białowieży w owym czasie funkcjonowało kino, prowadzone przez Ligę Obrony Powietrznej i Przeciwgazowej, a więc taki pokaz mógł się odbyć. Niestety, od ukończenia filmu minęło prawie 86 lat i nie ma już wśród nas osób, które mogłyby to pamiętać.

Drugie dzieło w dorobku filmowym Józefa Lejtesa zyskało przychylne oceny krytyków filmowych. Podkreślano, że film odznacza się przede wszystkim żywą akcją, dobrą reżyserią i wspaniałymi zdjęciami plenerowymi z Puszczy Białowieskiej i Polesia („Nowy Kurjer" – nr 251/1929 napisał, że zdjęcia są „czyste, klarowne, piękne i efektowne"). Treść filmu została umiejętnie dostosowana do wymagań kina i dzięki temu napięcie i zainteresowanie u widza nie słabnie w miarę rozwijającej się akcji. Film uznano za nowy, poważny krok do przodu w rozwoju polskiego przemysłu filmowego.

„Gazeta Bankowa" (nr 252/1929) pisała: „W porównaniu z poprzednim jego [Lejtesa] filmem „Huragan" widzimy znaczny postęp reżyserski. Niektóre sceny są wprost kapitalne, pełne brawury i temperamentu. Rzecz oczywista, możnaby mieć pewne zastrzeżenia co do logiczności ujęcia niektórych scen jak np. sceny tańca na jarmarku białoruskim, lecz w jakim filmie nawet najbardziej sławnych reżyserów nie możnaby znaleźć jakiegoś „ale".

Doskonale wypadły zdjęcia wojenne, traktowane w sposób epizodyczny, świetnie i przejmująco jest ujęty pościg, głębokie wrażenie robią końcowe sceny w miasteczku i ślicznym chutorze Jana Zaremby.

Ozdobą filmu są przepiękne plenery, urocze zakątki z Polesia i puszczy Białowieskiej. Mimowoli ręce składają się do oklasków, patrząc na czyste wyraźne zdjęcia, w całej krasie przedstawiające bogactwo i urok natury".

W tym samym tonie wypowiadała się „Wielkopolska Ilustracja" (nr 43/1929): „Z dnia na dzień" ukaże nam po raz pierwszy piękno kresów wschodnich, przedstawiających dla filmu prawdziwą kopalnię tematów. Już dziś pewne jest, że ten film będzie apoteozą polskiej przyrody i polskiego krajobrazu".

A czasopismo „Kino Teatr" (nr 13/1929) dorzucało: „Śród takich błot, stworzono nowy polski film, będący wzruszającą pieśnią o wojnie i miłości, miłości wielkiej, niecodziennej, pasjonującej".



Irena Gawęcka i Adam Brodzisz w scenie zrealizowanej w Białowieży. Źródło: „Kino dla Wszystkich" nr 95/1929 r.

Były też opinie, że „Z dnia na dzień" jest filmem zbyt wojennym i zbyt smutnym. Za dużo w nim jest działań wojennych, rannych, smutku i bólu. Apelowano do filmowców, by zrozumieli, że publiczność ma dosyć już przeżyć wojennych, krwi i tragedii, że więcej chciałaby radości i pogody życia.

Krytycy bardzo dobrze ocenili grę artystów. Pisano, że Irena Gawęcka i obdarzony fenomenalną intuicją artystyczną Adam Brodzisz potrafili należycie wczuć się w odtwarzane przez siebie postacie, grali swobodnie, naturalnie i zajmująco. Doskonałą postać zazdrosnej chłopki stworzyła Ma-



Maria Gorczyńska wśród statystujących w filmie Poleszuków. Źródło: „Kino dla Wszystkich" nr 95/1929 r.

ria Gorczyńska – pełna zmysłowego czaru i kokieterii. Podobnie silną i przejmującą postać wykreował także Wiesław Gawlikowski. Reszta zespołu potrafiła dostroić się do całości.

Komplementowano też Józefa Lejtesa. Pisano, że dowiódł on swoim filmem, iż jest artystą rzetelnym, szczerze oddanym sztuce. Michał Waszyński, który współpracował z Lejtesem przy „Huraganie", powiedział o reżyserze, że jest to „artysta, który ma zdolności wrodzone i poczucie plastyki" („Kino Teatr" nr 11/1929).

Pochwały nie omijały i producenta filmu, młodej bydgosko-poznańskiej wytwórni „Dworkowski-Film". Zdaniem recenzentów wytwórnia zasłużyła tym obrazem na szczere wyrazy uznania. Wyrażano opinię, że „Z dnia na dzień" jest filmem, który śmiało możemy zaprezentować wobec zagranicy, że polska produkcja filmowa wkracza coraz bardziej w ramy poważnego przemysłu, zajmując w nim z wolna należne mu miejsce.

Nieco powściągliwsza w ocenach filmu była natomiast poznańska „Tęcza" (nr 46/1929), która wprawdzie uznała „Z dnia na dzień" za „niewątpliwy krok naprzód polskiej produkcji", ale zaraz dodała, że do doskonałości i zupełnej poprawności jeszcze mu dość daleko. Wytykała filmowi dłużyzny pewnych scen, brak pełnej spoistości między akcją a tłem, na którym się odbywa, co sprawiało, że w niektórych scenach prześliczne zdjęcia krajobrazu wysuwają się samodzielnie na plan pierwszy, tracąc artystyczne związki z poszczególnymi fragmentami filmu.

Józef Lejtes do chwili wybuchu II wojny światowej zrealizował jeszcze 11 filmów fabularnych, w tym kilka ekranizacji literackich. Został uznany za jednego z najwybitniejszych polskich reżyserów okresu międzywojennego. W czasie wojny nakręcił pełnometrażowy film dokumentalny o walkach Brygady Karpackiej na Bliskim Wschodzie i w płn. Afryce. Po wojnie, przez pewien czas, przebywał w Izraelu, następnie wyjechał do Stanów Zjednoczonych. Nadal realizował filmy, ale przedwojennego sukcesu nie udało mu się już powtórzyć. Współpracował z telewizją (nakręcił m.in. jeden z odcinków „Bonanzy"). Jego marzeniem było zrealizowanie filmu o Januszu Korczaku – niestety, żadna z wytwórni nie zainteresowała się tą propozycją. Józef Lejtes zmarł w Los Angeles, 27 maja 1983 roku, w wieku 81 lat.

Wracając do Puszczy Białowieskiej – kolejnym twórcą filmowym, który odwiedził z ekipą ten zakątek kraju, był Henryk Szaro. W początku 1930 roku zrealizował on w Białowieży sceny wędrówki skazańców oraz brawurowej ucieczki i pogoni do filmu pt. „Na Sybir". Ale już na kolejny film fabularny ten słynny w całym świecie masyw leśny musiał czekać aż do 1969 roku, kiedy to nakręcono w nim sekwencje z żubrami do filmu „Lokis" Janusza Majewskiego. W następnych latach Białowieżę odwiedziły ekipy realizacyjne filmów: „Kazimierz Wielki" Ewy i Czesława Petelskich, „Lato leśnych ludzi" Władysława Lesickiego, „Rykowisko" Grzegorza Skurskiego (w Puszczy powstał niemal cały film), „Biesy" Andrzeja Wajdy, „Tajemnica puszczy" Andrzeja Barszczyńskiego. Poza tym – w Białowieży zrealizowano również sceny do kilku seriali i filmów telewizyjnych.

Piotr Bajko ■

Успаміны з 1994 г.

***2.* Польшча.** Сітуацыя насельніцтва Польшчы ў другой палове года была цяжкая. Самае высокае беспрацоўе 16,9 % было ў жніўні і да канца снежня знізілася да 16 %. Інфляцыя за год знізілася з 32,6% да 24,5%. Прырост натуральны насельніцтва быў толькі 1,78 проміля і зніжаўся. Ад самагубстваў згінула ў 1994 годзе 4541 мужчын і 497 жанчын. Аднак яшчэ горшая сітуацыя была ў большасці ўсходніх дзяржаў, якія ад сацыялістычнай гаспадаркі перайшлі да капіталістычнай.

1 ліпеня атрымалі гарадскія правы Дробін і Осек.

6 ліпеня прыехаў у Польшчу з візітам прэзідэнт ЗША Біл Клінтан.

7 ліпеня Сейм прыняў закон Будаўнічае права.

14 ліпеня прыехала да мяне з Беластока дачка з сынамі і вечарам я з імі паехаў цягнікам у спальным вагоне ў Дом адпачынку „Энергапраекта” ў Свінавуссці, дзе месцы ў двух пакоях я выкупіў у маім былым бюро працы раней. Жонка не захацела ехаць і засталася ў Варшаве. Я, як раней, выкупіў два пакоі: у адным спаў я са старшэйым унукам Лукой, а па суседску Ірэна з малодшым сынам Грыгорыем.

Таксама, як год раней, правялі мы два тыдні ля мора. Два разы пераехалі мы граніцу і пабачылі мы блізка ад Свінавусця нямецкі горад ля мора Альбек і потым паехалі турыстычным аўтобусам на экскурсію ў Заходнюю Нямеччыну ў нямецкі Ганзапарк над Балтыйскім морам. Парк ляжыць ля аўтастрады А1 недалёка ад горада Зіркдорф. Парк гэты быў адкрыты 15 сакавіка 1977 года і называўся Ганзалянд, а ў 1987 годзе яго назвалі Ганзапарк. Парк ляжыць на плошчы 0,46 кв. км. І мае больш чым 125 атракцыёнаў. Унукі паездзілі там на розных каруселях, аўтамабілях, з’язджалі з розных штучных горак, уехалі мы ўсе ліфтам на высокую 50-метровую вежу і аглядзелі згары панараму парку. Цяжка апісаць і прыпомніць усё, што яны бачылі і на чым ездзілі. Вечарам у поўнач турыстычным аўтобусам пераехалі мы нямецкую граніцу і вярнуліся ў наш Дом адпачынку „Энергапраекта” ў Свінавусці. 28 ліпеня селі мы ў спальны вагон цягніка Свінавусце – Варшава і 29 ліпеня вярнуліся ў нашу кватэру ў Варшаве. Некалькі дзён дачка з унукамі гасцявалі ў нас у Варшаве і ў жніўні вярнуліся ў Беласток. І гэта быў наш апошні адпачынак у Свінавусці, бо „Энергапраекту” перастала аплачвацца трымаць дом адпачынку ў Свінавусці для сваіх працаўнікоў і прадалі яго. У капіталізме „Энергапраекту” не аплачвалася трымаць дом адпачынку для сваіх працаўнікоў і прадаваць на адпачынак месцы ў пакоях па ніжэйшых цэнах для працоўнікоў, якія менш зараблялі. Я плаціў тады амаль тры разы даражэй за месцы ў Доме адпачынку ў Свінавусці, чым малады інжынер, які пачаў працаваць і мне гэта аплачвалася. „Энергапраект” прадаў тады таксама Дом адпачынку ў Вісле-Глэмбцэ, у які ў летнія месяцы высылаў дзяцей працаўнікоў на адпачынак, а ў іншыя месяцы прадаваў пакоі для працаўнікоў. Я там адпачываў з жонкай і дзецьмі ад 15 да 30 чэрвеня 1961 года, а пасля летам ездзілілі туды мае дзеці.

11 жніўня ў катастрофе верталёта ў Даліне Альчынскай згінула 4 асобы.

25 жніўня ля Пясэчна ўпаў вялікі метэарыт, які назвалі Башкоўка.

31 жніўня закрылі ў Калетах вялікую Фабрыку цэлюлёзы і паперы.

29 верасня Сейм прыняў Закон аб бухгалтэрыі.

30 верасня на „абедзе драўскім “ сустрэўся прэзідэнт Лех Валэнса з камандным саставам Польскага Войска ў Драўску-Паморскім. Пасля гэтага Сейм абвінавацціў прэзідэнта ў парушэнні правілаў апалітычнасці войска.

3 кастрычніка Савет Міністраў прыняў рашэнне выслаць польскі кантынгент войск у Гаіці.

11 кастрычніка ва Вроцлаве камнем ударыў у галаву Войцеха Ярузельскага адзін з прысутных, калі ён падпісваў сваю кнігу.

21 лістапада на канферэнцыі журналістаў у Народным Банку Польшчы паказалі новыя афіцыйныя манеты і банкноты, якія маюць увайсці на наступны год пасля дэнамінацыі польскай валюты.

24 лістапада падчас канцэрту Голдэн Лайф у Гданскай Судаверфі наступіў пажар. Яе хтосьці падпаліў. Згінула 7 асоб, а некалькі дзесяткаў асоб было параненых.

14 снежня стварылі Банкавы Гарантыйны Фонд.

30 снежня атрымалі гарадскія правы Бодзэнтын, Імелін, Краснобруд, Любневіч, Новы Вісніч і Пшуў.

Беларусь

У 1991-1994 гадах у Беларусі выяўляўся крызіс, звязаны з трансфармацыяй дзяржавы, у сувязі з гэтым наступіла падзенне ВУП, расла інфляцыя, з’явілася беспрацоўе, панізіўся ўзровень жыцця насельніцтва. Рэформы амаль зусім не праводзіліся. Нацыянальная валюта ў 1992 годзе была альтэрнатыўная савецкаму рублю. У якасці адзінага сродку плацяжу беларускі рубель быў уведзены толькі ў 1994 годзе.

На Беларусі сітуацыя эканамічная дзяржаўных працаўнікоў з-за адсутнасці рэформ і вялікай інфляцыі была горшая чым у Польшчы. Заробкі за год панізіліся на 21%. І інфляцыя дасягнула 2221% пад канец 1994 года і эканоміка працягвала моцна скарочвацца.

10 ліпеня Аляксандр Лукашэнка ў другой туры прэзідэнцкіх выбараў балаціраваўся як незалежны кандыдат. У другой туры прэзідэнцкіх выбараў бралі ўдзел В. Кебіч, які набраў 17% галасоў і Аляксандр Лукашэнка, які атрымаў 80,1% галасоў. Прэзідэнтам Беларусі быў выбраны Аляксандр Лукашэнка, які 20 ліпеня склаў прэзідэнцкую прысягу.

21 ліпеня Міхал Чыгір стаў прэм’ер-міністрам.

Расія

1 ліпеня з касмадрома Байканур вылецеў касмічны карабель Саюз ТМ-19 з касманаўтамі Юрыем Маленчэнкам і Тальгатам Мусабаевым. Прыстыкаваліся яны да касмічнай станцыі „Мір” і вярнуліся на Зямлю 4 лістапада разам з нямецкім касманаўтам Ульфам Мербольдам Дытрыхам, які прыляцеў на касмічную станцыю „Мір” на касмічным караблі Саюз ТМ-20.

9 ліпеня прызямліўся касмічны карабель Саюз ТМ-18 з касманаўтамі В. Афанасьевым і Ю. Усачовым.

28 ліпеня чатыры тэрарысты захапілі аўтобус Пяцігорск-Стаўропаль-Краснагвардзейск з 41 пасажырам. Аўтобус адбілі і згінулі два тэрарысты, другія два памерлі пасля ў бальніцы.

29 ліпеня ў Мінеральных Водах група чачэнскіх тэрарыстаў захапіла верталёт з заложнікамі. Пачас аперацыі вызвалення верталёта 4 асобы згінулі , а 15 было параненых. Усе тэрарысты былі захоплены жывымі.

1 жніўня ад выбуху бомбы згінуў у Ноўгарадзе 1 чалавек.

7 жніўня ў Башкірыі ад прарыва Тырляндскага вадасховішча згінула 29 асоб, а 786 асоб засталіся без прытулку.

10 жніўня ў Грозным прайшоў з'езд прыхільнікаў Джохара Дудаева, якія аб'явілі вайну Расійскай Федэрацыі. 11 жніўня прэзідэнт Б. Ельцын заявіў, што „сілавое ўмяшанне ў Чачні недапушчальнае", бо падымецца супраць Расіі ўвесь Каўказ і крыві, якая пальецца, Расіі ніхто не прабачыць. Аднак пасля змяніў погляд.

30 жніўня расійскае войска выйшла з Латвіі і Эстоніі.

30 жніўня выбух бомбы ў Екацерынбургу параніў 2 асобы.

31 жніўня закончылася вывядзенне расійскіх войск з Нямеччыны.

2-6 верасня падчас афіцыйнага візіту ў Расіі старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Цзян Цземіна падпісана была расійска-кітайская дэкларацыя аб ненацэльванні стратэгічных ядзерных ракет адзін на аднаго, нескарыстанні першым з ядзернай зброі, згодзе на існуючую расійска-кітайскую дзяржаўную граніцу ў яе заходняй частцы.

9 верасня ля Егораўска сутыкнуліся самалеты Ту-134АК і Ту-22М3. Самалёт Ту-134АК упаў на зямлю і згінула 8 асоб.

13 верасня згінуў у Маскве на вул. 2-ой Тверской-Ямской ад выбуху бомбы ў аўтамашыне лідэр Арэхаўскай Арганізацыі Злачыннай Групы Сяргей Цімафееў, якога называлі „Сільвестрам".

26 верасня ў катастрофе расійскага самалёта Як-40 расійскай кампаніі „Чэрэмашка" пад Ванаварай згінула 29 асоб.

27-28 верасня прэзідэнт Б. Ельцын паляцеў з візітам у ЗША. Было падпісана там супольнае заяўленне прэзідэнтаў аб стратэгічнай стабільнасці і ядзернай бяспецы, было прынята супольнае заяўленне аб гандлю і супрацоўніцтве.

3 кастрычніка наступіў старт касмічнага карабля Саюз ТМ-20 з касманаўтамі Аляксандрам Віктарэнкам, Аленай Кандаковай і немецкім касманаўтам Ульфам Мербольдам Дытрыхам. Прыстыкаваліся яны да касмічнай станцыі „Мір" і Ульф Дытрых вярнуўся на Зямлю на касмічным караблі Саюз ТМ-19 з касманаўтамі Юрыем Маленчанкам і Тальгатам Мусабаевым, а іншыя вярнуліся на зямлю 22 сакавіка 1995 г. з касманаўтам-лекарам Валерыем Паляковым, які выляцеў на касмічную станцыю „Мір" 8 студзеня 1994 г. на касмічным караблі Саюз ТМ-18.

11 кастрычніка курс рубля на Маскоўскай міжнароднай біржы ўпаў з 2833 да 3926 рублёў за долара.

Ад 17 да 20 кастрычніка першы раз прыехала з візітам у Расію каралева Вялікабрытаніі Елізавета.

21 кастрычніка Дзяржаўная Дума прыняла першую частку Грамадзянскага Кодэкса Р.Ф.

29 кастрычніка пры пасадцы ў аэрапорце Чыта наступіла катастрофа самалёта Ан-12А. Згінула 23 асобы.

11 лістапада Дзяржаўная Дума прыняла закон, які змушаў усіх замежных асоб, якія прыязджалі ў Расію, мець тэст на СНІД.

18 лістапада чачэнская тэрарыстычная група бомбай разбурыла чыгуначны мост на рацэ Яузе ў Маскве.

25-26 лістапада апазіцыйным сілам, якія выступілі ў Чачні супраць Джохара Дудаева, не ўдалося захапіць сталіцу Чачні, Грознага.

11 снежня расійскае войска ўвайшло ў Чачню, пачалася ваенная аперацыя.

14 снежня прэзідэнт Б. Ельцын скіраваў да Джохара Дудаева ультыматум, з жаданнем зложыць зброю. Гразіў, што пачнецца штурм Грознага.

24-28 снежня ў Чачні пачаліся баі расійскага войска з сепаратыстамі Джохара Дудаева за Ханкалу.

31 снежня пачаўся штурм Грознага расійскім войскам.

Іншыя дзяржавы

3 ліпеня ў Баку ў метро ў вагоне цягніка, які выехаў з станцыі „28 мая" і не даехаў да станцыі „Гянджлік" ад выбуху бомбы згінула 13 асоб, а 58 пасажыраў было параненых.

8 ліпеня ў ЗША наступіў 63 старт (STS-65) па праграме Спейс Шатл і 17 палёт шатла „Калумбія" з касманаўтамі Робертам Кабанам, Джэймсам Холселам, Рычардам Хабам, Карлам Уолзам, Лерай Чыао, Дональдам Томасам і японцам Тыакім Нанто-Муканам. Вярнуліся 23 ліпеня.

8 ліпеня памёр тварэц Паўночнай Карэі (КНДР) Кім Ір Сен, які кіраваў Паўночнай Карэяй ад 1948 г. 12 ліпеня на яго месца ўвайшоў яго сын Кім Чэн Ір.

10 ліпеня ў другой туры прэзідэнцкіх выбароў ва Украіне Леанід Кучма перамог прэзідэнта Леаніда Краўчука і стаў новым прэзідэнтам Украіны. Леанід Кучма атрымаў 52,15% галасоў, а Леанід Краўчук – 45,06 %.

У Буэнас-Айрэсе ў сяміпавярховы будынак аргентынскага яўрэйскага культурнага цэнтра ўдарыў смертнік самаходам з бомбамі. Згінула 89 асоб, а больш чым 200 асоб было параненых.

19 ліпеня Леанід Кучма стаў прэзідэнтам Украіны да 23 студзеня 2005 г.

25 ліпеня ў Вашынгтоне прэм'ер-міністр Ізраіля Іцхак Рабін і кароль Іарданіі Хусейн падпісалі дэкларацыю аб заканчэнні вайны.

26 ліпеня ад выбуху бомбы каля ізраільскага пасольства ў Лондане было раненых 14 асоб.

26 ліпеня ва Усходнім Калімантане ў Інданезіі разбіўся самалёт „Сікорскі- 58ЕТ" . Згінула 18 асоб.

26 ліпеня ад турэцкай бамбёжкі згінула ў Іраку 70 курдаў.

11 жніўня на Кубе Фідэль Кастра пазволіў сваім грамадзянам выязджаць з Кубы. Да канца жніўня пакінула Кубу 20 тысяч грамадзян.

13 жніўня ў Бразавіль у Конга падчас евангельскага казання згінула амаль 150 асоб, пераважна дзяцей, з-за панікі.

18 жніўня падчас землятрусу ў Алжыры згінула 171 асоба.

8 верасня ў ЗША пад Пітсбургам разбіўся амерыканскі самалёт Боінг 737-3Б7. Згінула 132 асобы.

8 верасня астатнія французскія, брытанскія і амерыканскія салдаты выехалі з Берліна.

9 верасня ў ЗША наступіў 64 старт (STS-64) па праграме Спейс Шатл і 19 палёт шатла „Дыскаверы" з касманаўтамі Рычардам Рычардсам, Блэйнам Хамондам, Джэры Лінenджэрым, Сьюзан Хемес, Карлам Мідам і Маркам Лі. Вярнуліся 20 верасня.

10 верасня папа рымскі Ян Павел ІІ пачаў візіт у Харватыі.

19 верасня Войска ЗША ўвайшло на Гаіці, каб вярнуць туды былога прэзідэнта Арыстыда, якога выгнала ваенная хунта.

22 верасня ў чыгуначнай катастрофе ў Анголі згінула 350 асоб.

28 верасня паблізу Фінляндыі на Балтыйскім моры затануў паром „Эстонія" з аўтамашынамі. Згінула 852 асобы.

30 верасня наступіў у ЗША 65 старт (STS-68) па праграме Спейс Шатл і 7 палёт шатла „Індэвор" з касманаўтамі Майклам Бейкерам, Тэрэнсім Уілкатам, Томасам Джоунсам, Стывенам Смітам, Дэніэлам Бершам і Петэрам Уайсофам. Экспедыцыю выслалі для абслугі тэлескопа Хабла. Вярнуліся 14 кастрычніка.

30 верасня ў Славакіі прайшлі першыя парламенцкія выбары. Перамогу атрымаў „Рух за дэмакратычную Славакію", які атрымаў 34,96 % галасоў.

1 кастрычніка рэспубліка Палау атрымала незалежнасць ад ЗША.

4 кастрычніка ў Швейцарыі спалілі сябе 48 членаў секты „Ордэн Храма Сонца".

12 кастрычніка ў катастрофе самалёта Фокер-Ф28 у Іране згінула 66 асоб.

16 кастрычніка ў рэферэндуме ў Фінляндыі 56,9% фінаў прагаласавала, што хочуць быць ў Еўрасаюзе. Галасавала 70,8 % насельніцтва.

17 кастрычніка Вілі Клас стаў генеральным сакратаром НАТА да 20 кастрычніка 1995 г.

21 кастрычніка над ракой Ганай у Сеуле ў Паўднёвай Карэі разбурыўся мост. Згінула 32 асобы.

31 кастрычніка ў катастрофе амерыканскага самалёта АТР-72-212 у раёне горада Роузлоун у штаце Індыяна згінула 68 асоб.

3 лістапада наступіў у ЗША 66 старт у космас (STS-66) па праграме Спейс Шатл і 13 палёт шатла „Атлантыс» з касманаўтамі Дональдам МакМонаглам, Куртысам Браунам, Элен Очоа, Джозефам Танерам, французам Жан Франсуа Клервуа і Скотам Паразінскім. Вярнуліся 14 лістапада.

13 лістапада пасля рэферэндума Швецыя стала членам Еўрасаюза.

14 лістапада адкрылі рух паміж Парыжам і Лонданам праз тунель пад Ла-Маншам.

26 лістапада Вярхоўны Савет Абхазіі прыняў Канстытуцыю незалежнай, дэмакратычнай дзяржавы – Рэспублікі Абхазіі. Выбралі тады прэзідэнтам Уладзіслава Ардзінба.

27-28 лістапада ў рэферэндуме большасць нарвегаў прагаласавала супраць уваходу ў Еўрасаюз.

23 снежня ў Босніі і Герцагавіне пачаліся перагаворы з удзелам былога прэзідэнта ЗША Джымі Картэра аб заканчэнні баёў .

Дзмітры Шатыловіч

Працяг будзе

Чаржынскі і Казань

Беларускі літаратуразнавец, крытык, лексікограф і педагог Уладыслаў Чаржынскі (1897-1974) нарадзіўся на Беласточчыне. Пачатковую адукацыю атрымаў у народным вучылішчы. Скончыў Мінскую гімназію і Белдзяржуніверсітэт. Працаваў настаўнікам на Лагойшчыне, а таксама выкладчыкам у Інстытуце беларускай культуры і ў Камуністычным універсітэце Беларусі. З 1922 года пачаў выступаць з крытычнымі і літаратуразнаўчымі артыкуламі ў беларускім друку. А з 1925 года супрацоўнічаў з часопісам „Полымя".

Уладыслаў Чаржынскі пад сваім уласным прозвішчам, а таксама пад псеўданімамі Ул. Дзяржынскі і Улідзе друкаваў артыкулы, у якіх даваў грунтоўны эстэтычны аналіз, як асобных мастацкіх твораў, так і літаратурнага працэсу ў цэлым. Многія яго матэрыялы, прысвеча-

ныя творчасці Янкі Купалы, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Міхася Чарота, Цішкі Гартнага, Янкі Журбы і іншым беларускім пісьменнікам, уражваюць і сёння глыбінёй і жывасцю даследчыцкай думкі, аргументаванасцю і пластычнасцю стылю. Працы Уладыслава Чаржынскага каштоўныя сёння яшчэ тым, што ў супярэчлівы і жорсткі час канца 1920-х гадоў у сваіх ацэнках ён кіраваўся эстэтычнымі крытэрыямі, а не вульгарна-сацыялагічнымі догмамі. Вельмі шкада, што беларусы ў 1930 годзе страцілі вельмі таленавітага, разважлівага і аб'ектыўнага крытыка. Яго крытычныя артыкулы і даследаванні параскіданы па выданнях 1920-1930-х гадоў. Ці не пара ўжо іх сабраць пад адну вокладку і выдаць?..

19 лютага 1925 года была створана літаратурная секцыя Інбелкульту (40 сяброў), якая потым аб'ядналася з секцыяй беларускай мовы. Сакратаром аб'яднанай секцыі быў Уладыслаў Чаржынскі. Ім жа апрацоўваліся матэрыялы па гісторыі беларускай літаратуры для кніг прафесара М. Янчука, Я. Барычэўскага, А. Вазнясенскага. А ў 1926 годзе ён разам з Максімам Гарэцкім і Паўлам Караваем падрыхтаваў і выдаў дапаможнік „Выпісы з беларускае літаратуры XIX — пачатку XX стагоддзя". Праўда, у Мінску ў 1928 годзе выйшла і асобным выданнем праца Уладыслава Чаржынскага „Да пытання аб псіхалагічным стылі нашаніўскай паэзіі". І, як піша Аўген Калубовіч у сваёй кнізе „На крыжовай дарозе" (Мн., 1994. С. 87), Чаржынскі з'яўляецца таксама аўтарам „Слоўніка гісторыка-грамадазнаўчых тэрмінаў".

Ссылка ў Казань

28 чэрвеня 1930 года Уладыслаў Чаржынскі быў арыштаваны ДПУ БССР па справе „Саюза вызвалення Беларусі". Па пастанове Калегіі АДПУ СССР ад 10 красавіка 1931 года яго выслалі ў Казань тэрмінам на 5 гадоў. Праз 4 гады нашага земляка вызвалілі ад высылкі, але рэабілітавалі яго толькі пасля смерці ў 1988 годзе.




Уладыслаў Чаржынскі, фота канца 1930-х гадоў



Уладыслаў Чаржынскі, фота канца 1960-х гадоў

З Татарстана больш Уладыслаў Чаржынскі на Бацькаўшчыну не вярнуўся. Але ці поўнасцю адышоў ён ад літаратурнай і крытычнай дзейнасці — цяжка сказаць. Тым не менш, беларускімі пісьменнікамі і роднай літаратурай ён моцна цікавіўся і тады, калі 40 гадоў жыў у сталіцы Татарстана.

У архівах і музеях Казані адшукаў цікавыя звесткі пра Уладыслава Чаржынскага. У архіве Казанскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта захоўваюцца дзве асабістыя справы Уладыслава Чаржынскага за перыяд 1933-1946 гадоў і 1950-1971 гадоў. Найбольш каштоўнымі дакументамі з'яўляюцца асабісты лісток па ўліку кадраў і характарыстыкі Чаржынскага, розныя загады, справаздачы і выпіскі, фотаздымкі і іншыя матэрыялы. Знойдзена таксама аўтабіяграфія нашага земляка, якая напісаная ім асабіста 27 красавіка 1943 года: „Нарадзіўся я ў 1897 годзе ў былой Гродзенскай губерні Сакольскага павета, вёсцы Стара-Каменная (па іншых крыніцах Старакаменная — С.Ч.) у сялянскай сям'і. У бацькі майго было 5 дзесяцін зямлі, якую ён апрацоўваў сам асабіста пры дапамозе сваёй сям'і. Пачатковую адукацыю я атрымаў у пачатковым народным вучылішчы, пасля заканчэння якога паступіў у



Л. 9.

ВЫПИСКА ИЗ ПРИКАЗА №. I25
Директора Казанского Государственного Медицинского Института
от 2I/X-I933 года
§ 6.

Зачислить с I-го Октября с/г. следующих преподавателей русского языка для занятий с татарами, плохо владеющими русским языком с оплатой по часа из расчета ассистентской ставки

ЧАРЖИНСКОГО с годовой нагрузкой в I80 часов и оплатой 945 руб. в год
ЧЕНЧУРИНУ - т о ж е
ТРИФОНОВА И.А. - с годовой учебной нагрузкой I90 часов и оплатой 997 р.50 к. в год.
БОГДАНОВИЧ - т о ж е.

Зав. кабинетом русского языка ДУБРОВИНОЙ установить учебную нагрузку в I90 часов с оплатой 997 р.50к. в год.
ОСНОВАНИЕ: заявление Врид Пом.Директора по Уч.ч.т.МУСТАФИНА от I6/X-33 г.

П.п.Директор КГМИ проф. АЛУФ
С подлинным верно: Врид Секретаря (Чердынцева)

Выпіска з прыгавора дырэктара Казанскага дзяржаўнага медінстытута

Гродзенскую казённую гімназію, дзе і вучыўся да 1914 года (пасля яе эвакуацыі перавёўся ў Мінскую гімназію — С.Ч.). Матэрыяльную дапамогу атрымліваў ад старэйшага брата, які знаходзіўся на заробках у Амерыцы. У 1915 годзе мая радзіма была акупіраваная нямецкімі войскамі. Я паехаў у Ленінград, дзе і працягваў сваю адукацыю. У 1917 годзе я пераехаў у Мінск і да 1920 года працаваў хатнім настаўнікам у Вілейскім павеце. У 1921 годзе паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт на этнолага-лінгвістычнае аддзяленне, якое скончыў у 1925 годзе. У час вучобы ва ўніверсітэце, працаваў у беларускім дзяржаўным выдавецтве і выкладаў на рабфаку ўніверсітэта. З 1925 года працаваў у якасці навуковага супрацоўніка ў Інстытуце беларускай культуры, а потым у Беларускай Акадэміі Навук. Адначасова выкладаў у Беларускім камуністычным універсітэце. У 1930 годзе я быў адміністратыўна высланы з Мінска ў горад Казань, тэрмінам на пяць гадоў. У Казані з 1931г. да 1935 года я працаваў метадыстам у Інстытуце павышэння кваліфікацыі настаўнікаў і ў педагагічным інстытуце. З 1933 года па сумяшчальніцтву працаваў выкладчыкам у Казанскім дзяржаўным медыцынскім інстытуце (да 1936 года), а затым да 1940 года штатным выкладчыкам. З 1940 года штатную пасаду выкладчыка займаю ў Казанскім дзяржаўным стаматалагічным інстытуце, а ў КДМІ працую па сумяшчальніцтву".

У медыцынскіх навучальных установах Казані Уладыслаў Чаржынскі выкладаў латынь, нямецкую і рускую мовы. Пра гэта гавораць розныя загады і выпіскі з загадаў кіраўнікоў навучальных устаноў Казані. А знойдзеная характарыстыка на выкладчыка кафедры замежных моваў Казанскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута Чаржынскага Уладыслава Вікенцьевіча дае поўнае ўяўленне пра гэтага выкладчыка і чалавека наогул: „Чаржынскі У.В., які працаваў выкладчыкам Казанскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута з 1 верасня 1933 года і вызвалены з працы 1 снежня 1947 года, як сумяшчальнік, у сувязі з яго асноўнай працай у Казанскім дзяржаўным стаматалагічным інстытуце, 1 верасня 1950 года быў зноў залічаны выкладчыкам Казанскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута, дзе і працуе па сённяшні час. Тав. Чаржынскі У.В., кваліфікаваны, вопытны і дысцыплінаваны педагог, адносіцца з любоўю і стараннасцю да сваёй работы. Прымае актыўны ўдзел у метадычнай рабоце кафедры, выступаў на пасяджэннях кафедры з дакладамі па пытаннях методыкі выкладання моў. Чаржынскі У.В. сістэматычна займаецца павышэннем свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню, актыўна ўдзельнічае на занятках, якія арганізавалі для выкладчыкаў кафедры, хто самастойна вывучае гісторыю СССР. Пастаянна працуе над удасканаленнем сваёй вытворчай кваліфікацыі, прымае ўдзел у рабоце кафедры над складаннем дапаможнікаў па нямецкай мове для медыкаў. Сярод таварышаў па працы і студэнтаў тав.Чаржынскі У.В. карыстаецца заслужаным аўтарытэтам".

Сярод выяўленых казанскіх дакументаў ёсць і цікавая выпіска з загада № 91 рэктара Казанскага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга медыцынскага інстытута імя С.В.Курашова ад 19 мая 1967 года. У ёй гаворыцца, што ў „сувязі з 70-годдзем і 45-годдзем педагагічнай дзейнасці, з якіх 35 гадоў аддадзена падрыхтоўцы медыцынскіх кадраў у стаматалагічным і медыцынскім інстытутах Казані, за бездакорную творчую працу, чулыя і прынцыповыя адносіны да студэнтаў старшаму выкладчыку У.В.Чаржынскаму аб'явіць падзяку з занясеннем у асабістую справу. Падстава: прапанова заг. кафедры К.Л.Раскіна. Рэктар інстытута — прафесар Х.Хамітаў". Дарэчы, у той час у Казанскіх медыцынскіх навучальных установах працавала вельмі многа ўраджэнцаў Беларусі, асабліва шмат было яўрэяў. Той самы Канэль Раскін быў родам з-пад Оршы, Ісак Алуф быў родам з Полацка і іншыя. Магчыма, дзякуючы іх дапамозе, Уладыслаў Чаржынскі ў 1930-х гадах і ўладкаваўся на працу ў Казанскі медінстытут. А, магчыма, дзякуючы яго жонцы Чэрні Плаўнік.



Казанскі медінстытут, дзе працаваў Уладыслаў Чаржынскі

У чэрвені 1971 года Уладыслаў Чаржынскі напісаў на імя рэктара заяву „вызваліць яго ад займа-

емай пасады ў сувязі з уходам на пенсію”. Тым больш, што яму ўжо было тады 74 гады. Рэктар задаволіў просьбу Чаржынскага.

У Казані Уладыслаў Чаржынскі пражыў яшчэ тры гады і 2 красавіка 1974 года яго не стала. Там яго і пахавалі на Арскіх могілках.

Янка Купала і Уладыслаў Чаржынскі

У Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы ў Мінску захоўваюцца купалаўскія запісы (адз. зах. 459-461) маскоўскіх і казанскіх тэлефонаў і адрасоў асоб, з якімі паэт быў звязаны па службовых і асабістых справах. Сярод адрасоў Казані знаходжу і каардынаты Чаржынскага: „Чаржынскі. Держинского, 15, кв. 8”. У лістападзе 1941 года Янка Купала прыехаў у Татарстан і пасяліўся разам з Уладыславай Францаўнай непадалёку ад Казані ў пасёлку Пячышчы ў дырэктара мельзавода І.Я.Наякшына. Тут ён жыў і час ад часу наведваў Казань, дзе спыняўся ў гасцініцы „Татарстан”. З Наякшынымі Купала шчыра сябраваў, яны разам нават сустракалі новы 1942 год на кватэры Юдзіных у г. Верхнім Услоне.

Янка Купала часта выступаў на мітынгах, па радыё, з дакладамі сярод беларускай і татарскай інтэлігенцыі, пісаў вершы і прадмовы. Заходзіў ён у госці і да сям’і Чаржынскіх. Дарэчы, жонкаю Уладыслава Чаржынскага была родная сястра Змітрака Бядулі — Чэрня Плаўнік.

З Уладыславам Чаржынскім Янка Купала ў Казані шмат гутарыў, яны вялі размовы пра вайну, пра 1920-1930-я гады і рэпрэсіі, а таксама пра літаратуру.

4 мая 1942 года Янка Купала зноў сустрэўся з сям’ёй Чаржынскіх, якая наведала яго ў Пячышчах. Песняр падараваў Чаржынскім сваю кнігу вершаў і паэм „От сердца”, што выйшла на рускай мове ў Маскве. На кнізе Купала напісаў „Дарагім Чаржынскім на памяць. Янка Купала. Пячышчы. 4.V.1942 г.”

18 чэрвеня Янка Купала пакінуў Татарстан і прыехаў у Маскву, дзе праз 10 дзён трагічна загінуў у гасцініцы «Масква».

Сяргей Чыгрын

Fotografia rodzi się wewnątrz fotografa

Fotografie Piotra Świderskiego są jak chwila wytchnienia. Autor zabiera nas w podróż po podlaskich bezdrożach, po których on sam wędruje bez pośpiechu i popędzania. Wielokrotnie powraca do tych samych, dobrze znanych mu miejsc i krajobrazów, ulubionych świątków i krzyży, aby obok nich posiedzieć, odpocząć, pomedytować lub po prostu – poobserwować. Tematem jego zdjęć są najczęściej napotkani ludzie, znajomi i nieznajomi, zastani w domu, w świątyni, na ulicy, po prostu – w drodze.

Noc na Grabarce, świętej górze podlaskiego prawosławia, jest pełna czuwania, szeptanych modlitw i monotonnych śpiewów. Gorączka sierpniowego dnia z plątaniną tysięcy nóg i rąk stopniowo wygasła. Ci, którzy zostali, szukają wyciszenia. Jest północ. Niektórzy kładą się spać między drewnianymi krzyżami, których stoją tutaj tysiące, ale większość czuwa całą noc, siedząc na ławeczkach, w blasku świec. W ich ciepłym, drgającym świetle z mroku wyłaniają się twarze. Wśród nich jest także Piotr Świderski, fotografik. Przyjeżdża na Grabarkę od wielu lat. Wytrwale i z cierpliwością wykonuje portrety pielgrzymów. W tym roku (2014 – aut.) występuje w roli podwójnej: fotografika i pielgrzyma. Przyjechał z osobistą intencją. Grabarka to miejsce magnetyczne – mówi – to jest świat, który trudno znaleźć gdziekolwiek.

Obok niego raz po raz przechodzą inni fotografowie, których na Grabarce z roku na rok jest coraz więcej. Reporterzy o doskonałym refleksie i szybkości, niespokojni, ciągle w ruchu, polujący na ciekawe kadry i twarze niczym myśliwi, nierzadko zaskakujący swoich modeli niespodziewanym pstryknięciem prosto w twarz lub celujący w nich z ukrycia. Piotr Świderski to biegun całkowicie przeciwstawny do fotografii szybkiej i drapieżnej. On się nigdzie nie śpieszy, nie biega, nie pokonuje na siłę oporu materii. Raczej poddaje się jej, dostosowuje, wtapia. Kontempluje chwile, nastrój, człowieka. Nie musi robić zdjęć. Często jest jedynie obserwatorem. Dzisiejszy dzień zalicza do udanych – udało mu się zrobić aż dwa zdjęcia. Ludzie, których portretuje, nie są przypadkowi. Ich twarze muszą mieć owe „coś” – nieuchwytne, trudne do sprecyzowania, ale poruszające duszę. Bohaterami zdjęć Piotra są zwykli ludzie, przypadkowi przechodnie wtopieni w swoje codzienne otoczenie, nierzadko przy pracy. Na zdjęciach Piotra nie znajdziecie cyfrowych fajerwerków, sztuczek ani ulepszeń. Interesuje go człowiek *saute*. Życie bez sztucznych barwników i konserwantów. „Artysta fotografik” – ten dumnie brzmiący tytuł,

dzisiaj trochę zapomniany, w przypadku Piotra Świderskiego ma pełną rację bytu – wyważona kompozycja, nieprzypadkowa pogoda, długo wyczekany moment składają się na fotografie tchnące spokojem, harmonią i równowagą.

Nawet system pracy i sprzęt fotograficzny współgrają z filozofią życia i fotografowania, które przecież przeplatają się w sposób naturalny. Podobnie jak jego mistrzowie z lat 70-80. XX wieku fotografuje aparatem analogowym, na czarno-białych kliszach fotograficznych. Na wyprawy zabiera najczęściej średnioformatową lustrzankę dwuobiektywową. Fotografią zajmuje się od piętnastu lat. Pierwszy swój aparat zdobył za przysłowiową butelkę wódki i od tego się zaczęło. Od razu zakochał się w kwadratowym kadrze. Kwadrat to harmonia równych boków – twierdzi – i większa swoboda w kadrowaniu. Odbitki także powstają w sposób tradycyjny – w ciemni fotograficznej.


Uważa, że zdjęcia czarno-białe, w odróżnieniu od kolorowych, dają większe możliwości skupienia się na formie, na geometrii, ciekawych kontrastach i przejściach tonalnych. Lubi zdjęcia nieugłaskane, które podobnie jak życie mogą mieć niedoskonałości – na papierowej odbitce często widać kurz i brud, zarysowania. Nie usuwa tego, bo uważa że tak zwane „analogowe mięcho" dodaje fotografii autentyczności.

Za główny temat swojej twórczości obrał człowieka. – W człowieku ujmuje mnie wszystko – opowiada – to co dobre i to co złe. Może najbardziej to co słabe – to czego się tak wstydzimy, że jesteśmy czasami bezradni i nic z tym nie potrafimy zrobić. Możemy tylko spojrzeć w niebo i zrozumieć, że sami nie zdołamy istnieć. Tylko Bóg i inny człowiek mogą dać oparcie. Czasami drepczemy w miejscu przez lata i to dreptanie, nieporadność, jest ciekawe i wspólne dla wielu ludzi, bez znaczenia jeśli chodzi o urodzenie, zawód czy majętność.

Najbardziej interesuje go portret dokumentalny, środowiskowy. Uważa, że ten sposób przedstawienia człowieka najbardziej nadaje się do opowiadania historii, a to właśnie jest głównym celem twórczości Piotra. To, co widać na zdjęciu, to tylko część opowieści. Druga część to opowiadanie tejże historii poprzez przepuszczanie jej przez siebie, przez swoje myśli, uczucia. Opowiadacz historii może opowiedzieć tylko tyle, ile sam zrozumiał i przeżył. Produkt ostateczny, czyli gotowe zdjęcie, to wewnętrzny świat fotografa. Cała reszta jest nieważna.

Aby szukać bohaterów swoich opowieści, nie wyjeżdża daleko. Fotografuje krainę, w której urodził się i wychował, czyli Podlasie. – To jest moje otoczenie – tłumaczy – tu żyję i żyłem przez lata, więc naturalne jest dla mnie, że o nim opowiadam. Portret jest dla mnie zawsze najciekawszy. Można robić zdjęcia na warszawskiej Pradze – pokazać obdrapane mury, rozwalające się budynki i choć są one niesamowicie fotogeniczne, to bez twarzy zamieszkujących je ludzi – są puste. Ludzie nadają miejscom znaczenie. Tak samo jest na Podlasiu. Są tu piękne miejsca, cudowne krajobrazy, zapierająca dech w piersiach przyroda, ale pokazanie w tych okolicznościach człowieka – jego miejsca i znaczenia – jest niezwykle interesujące. To mnie pociąga. Twarze same się znajdują. Nie wierzę w „myślenie nad zdjęciem". Ono nie powstaje w głowie. Zdjęcie to ułamek sekundy, moment w szukaniu kadru przez wizjer – mówię do siebie wtedy „nie", „nie", „TAK" – gdzie „tak" oznacza ten odpowiedni moment – i wtedy naciskam spust migawki. Trzeba uwolnić swój umysł i nie myśleć a czuć. Działać intuicyjnie. Tylko wtedy powstaje coś ciekawego. Fotografia płynie z głębi człowieka – kiedy obraz na matówce aparatu cię urzeka i jednym naciśnięciem palca zatrzymujesz go na zawsze. Co ciekawe nie da się tego powtórzyć, nie można powiedzieć – „nie zdążyłem zrobić zdjęcia, ale spojrzę jeszcze raz w ten sam sposób". Po chwili próby zdajesz sobie sprawę, że to niemożliwe.

Najczęściej jeździ bez celu, gdzie oczy poniosą. Czasem planuje wyprawę przez kilka dni, ale wcale nierzadko zdarza się, że po obudzeniu nagle przychodzi pragnienie – jechać. Wtedy po prostu pakuje sprzęt i wyjeżdża. Podlaskie bezdroża eksploruje sam, niekiedy z przyjaciółmi. Nie ma udeptanych tras ani ulubionych miejsc, chociaż są takie, do których powraca. Szczególnym sentymentem



Piotr Świderski

darzy drewniane krzyże przydrożne, czy stary, rozwalający się wiatrak nieopodal Hodyszewa. Powraca tam po to, by pooddychać powietrzem, usiąść na kamieniu i pokontemplować krajobraz. Taka wyprawa nie musi kończyć się zrobieniem fotografii, co więcej – gdy patrzy w przeszłość, odkrywa, że najczęściej wracał do domu bez zdjęć. Bo najważniejsza jest sama droga.

Ta droga prowadzi gdzie chce i jak chce, tak się jednak dziwnie składa, że na tereny położone między Bielskiem Podlaskim, Hajnówką a Czeremchą prowadzi go częściej niż gdzie indziej. Dlaczego tak się dzieje? Może


dlatego, że dla Piotra droga to nie tylko pokonywana przestrzeń, ale także – czas. To podróż do miejsc i obrazów z przeszłości, do krainy dzieciństwa. – To moja prywatna wyprawa w przeszłość – uważa – wycieczka mojej pamięci do lat dziecięcych – na wieś, gdzie się wychowałem. Wspominam je i tęsknię – opowiada Piotr. – Często to, co pokazuję na zdjęciach, np. wejście do piwnicy w podłodze, stary kredens lub piec kaflowy, są obrazami z dzieciństwa, tkwiącymi nie tylko w mojej głowie – jest wiele osób, które mają podobne wspomnienia. Na zdjęciach ukazać chciałem dwie wędrówki: jedna to drogami napotykanych przeze mnie na szlaku osób, druga – w nicość, tam, dokąd odchodzą piękne podlaskie krajobrazy, a także ostatnie pokolenie ludzi w nie wrośniętych. Ten świat z dnia na dzień znika, oddala się, rozsypuje. O tym świecie chcę opowiadać. W ten sposób ocalać go od zapomnienia.


Ewa Zwierzyńska

Fotografie Piotra Świderskiego
















Рэцэнзіі, прэзентацыі

Z syropem lub bez



Rzadko kiedy poeta okazuje się również utalentowanym prozaikiem. Uładzimir Niaklajeu (ur. 1946) większym prozatorskim utworem „Łabuch” (Grajek) debiutował dosyć późno, bo w roku 2003, po powrocie z emigracji w Finlandii, gdzie zresztą książka powstała. Jednakże na prozatorski debiut w Polsce wybrana została inna powieść, pod poetyckim tytułem „Automat z wodą gazowaną z syropem lub bez” (2012), w świetnym, nawiasem mówiąc, tłumaczeniu Jakuba Biernata.

Autor opisuje lata 60. w Mińsku, wówczas stolicy Białoruskiej Socjalistycznej Republiki Radzieckiej, a zatem czasy swojej młodości. Prototypami większości bohaterów są przyjaciele i znajomi autora, których zresztą dziwnie brzmiących ksyw i imion nie sposób zapamiętać. Niaklajewowi udaje się ukryć sentyment do tamtych czasów. Przeszłość w zasadzie harmonijnie zlewa się u niego z teraźniejszością, nawet toponimika ówczesnego Mińska do dziś niewiele się zmieniła, a historie z młodości zaczynają coraz bardziej przeplatać się z historią najnowszą, czyli kandydowaniem Niaklajewa w ostatnich wyborach prezydenckich, w 2010 roku. Jego pobicie w dzień wyborów, późniejsze zniknięcie i długi, przynajmniej jak na dzisiejsze standardy, areszt zaczynają paralelnie współgrać z młodzieńczym uczestnictwem w fikcyjnej antyrządowej grupie, planującej zamach na Chruszczowa i innymi perypetiami szalonych lat 60.

Niektórym pisarzom, jak Sergiuszowi Piaseckiemu, znacznie lepiej wychodzi pisanie o rzeczach, które im się przydarzyły. Osadzenie powieści w Mińsku i jej autobiograficzność wydają się być dla Niaklajewa przeszkodą. Zwariowane przygody grupy przyjaciół stają się zbyt hermetyczne, aby mogły zainteresować przypadkowego, tym bardziej nie białoruskiego, czytelnika. W celu zuniwersalizowania białoruskiej historii autor wplątuje w narrację Lee Harveya Oswalda, późniejszego zabójcę Kennedy’ego. Oswald co prawda mieszkał przez jakiś czas w Mińsku, jednak wierzyć się nie chce, zwłaszcza gdy się trochę zna ówczesną rzeczywistość, że kiedykolwiek był członkiem ekipy opisywanej przez Niaklajewa, mimo że teoretycznie ich losy mogły się w jakiś tam sposób przeplatać.

Mińsk jako miejsce akcji nie dorównuje Joyce’owskiemu Dublinowi ani na chwilę, choć czasami wydaje się być miastem nawet sympatycznym. Lata Chruszczowowskiej odwilży trudno opisać wyłącznie z humorem bądź jedynie z goryczą i osiągnięcie pewnego balansu Niaklajewowi akurat się udaje. Książka nie jest zabawną historią dwudziestolatków, ani nie jest też wiernym opisem przymusowych pobytów w psychiatrykach, które podczas rządów Chruszczowa zastąpiły łagry. Swoista mieszanka śmiechu i goryczy jest czasami bardzo trafiona:

„– Społeczeństwo jest wydzieloną częścią przyrody – do szafki z książką w ręce podszedł syn Krupskiej i Hitlera. – W tej wydzielonej części są mniejsze wydzielone cząstki. Dlatego towarzysz Lenin dojrzał możliwość zbudowania socjalizmu w konkretnym państwie. A towarzysz Chruszczow – komunizmu w konkretnym szpitalu. W przybliżeniu na dwieście pięćdziesiąt milionów ludzi. Podliczyłem… – wyciągnął z książki papierek – przy normie sześciu metrów kwadratowych na człowieka powierzchnia szpitala komunizmu powinna wynieść jeden miliard pięćset milionów kilometrów kwadratowych. To jeden procent ziemskiego suchego lądu ogółem. W przybliżeniu”.

Młodość zazwyczaj jawi się w różowych barwach, jednak lata 60. są zaledwie o jedno pokolenie oddalone od drugiej połowy lat 30. i naturalne jest, że zbyt kolorowo być po prostu nie powinno. Mimo to atmosfera z ZSRR zaczyna się, choć nieznacznie, zmieniać i dla Niaklajewa tę zmianę uosabia młodzieżowa gru-

pa subkulturowa stiljadzy (której, jak zaznacza tłumacz, w Polsce odpowiadali bikiniarze).

Mimo że przygody Kostka Worana, Guryka, Edzika, Pułkownika, Wiła i Biga, a także dwóch zmiennych muz towarzystwa, Neli i Asi, są opisane finezyjnie, to autor podjął się chyba jednak zadania zbyt ambitnego – stworzenia pierwszej w literaturze białoruskiej powieści miejskiej, a jednocześnie wyniesienia tejże literatury poza kontekst białoruski. Czytając ma się wrażenie, że do jednego worka wrzucono zbyt wiele: stiljagów, Chruszczowa, Oswalda, mińskich Żydów, Tatarów, Murzyna gwałciciela z Gwinei, Louisa Armstronga, a także tuzin kagebistów, szpiegów i im podobnych. Jak zaznacza autor, powieść powstawała w różnych okresach, w 2008, 2009 i 2011 roku i znajduje to odbicie również w strukturze książki. Pierwsza część jest trochę nudnawa. Młodzi bohaterowie myślą o dwóch panienkach i popijają wodę mineralną, nieważne z syropem czy bez. Zdecydowanie ciekawiej czyta się o tym, jak Wieniczka popija coś bardziej konkretnego w „Moskwie-Pietuszki" Jerofiejewa. W drugiej części, napisanej przez Nieklajewa już po burzliwych przejściach osobistych i kampanii prezydenckiej, opowieść jakby przyspiesza i nabiera polotu.

„Automat z wodą gazowaną z syropem lub bez", w odróżnieniu od pierwszej, wybitnej zresztą, powieści „Łabuch" jest książką poprawną z misją społeczno-literacką. W „Łabuchu" Niaklajeu jest człowiekiem wolnym, pisarzem o mnogich talentach. W „Automacie..." można niestety wyczuć kandydata, który przegrał z politycznym przeciwnikiem. Duża ilość panoramicznych zdjęć Mińska jedynie dodaje powieści szarości.

Może szkoda, że debiutem prozatorskim Niaklajewa w Polsce nie stał się „Grajek", ale „Automat..." ma szanse na, choćby i koniunkturalne, uznanie, Myślę, że powieść będzie w przyszłym roku ubiegała się o nagrodę Angelusa z dużymi szansami na jej uzyskanie.

Vital Voranaŭ ■

Цудадзейнае шкельца

Кароў пасвіць было куды лягчэй, чым авечак. Кароў гналі на Моргі або на Зады: там быў лес; да таго ж пастухоў было вельмі многа. З авечкамі было горш. Для іх прызначана было Чортава поле: шырокае і пустое, ніводнага дрэўца тут не было. Пасярэдзіне поля былі толькі дзве ямы. Сяляне называлі іх цагельняй. Старэйшыя тлумачылі, быццам калісь тут была цагельня, яшчэ пры дзедах-прадзедах. Не думаю, каб гэта была праўда. На Чортавым полі ніколі нічога добрага не магло быць. Там, дзе ходзяць авечкі, ніякая жывёліна пасвіцца не можа: авечкі выгрызаюць усё амаль з карэньчыкамі, а да таго ж страшэнна брудзяць пашу.

На Чортавым полі адчуваў я ў дзяцінстве нейкі нявыказаны, проста нечалавечы сум. Цяжкая туга сціскала сэрца, падыходзіла цвёрдым камяком пад горла, выціскала слёзы.

Пад вясну пачалі ў хаце раіцца, ці не зрабіць мяне авечым пастухом. Усё лета трэба будзе прабыць на Чортавым полі. А для мяне і адна гадзіна, праведзеная там, была вечнасцю.

– Не буду! – закрычаў я на ўсю хату. – Авечым пастухом не буду!

Усе жахі, якімі ў хаце пагражалі: аддаць цыганам, паслаць у рэкруты, выдаць у прыступы – здаваліся мне глупствам у параўнанні з абяцаннем прыставіць мяне да авечак.

І таму, затупаўшы нагамі па гліняным таку, я закрычаў яшчэ гасласней:

– Не буду!

Усе былі здзіўленыя. Дзядзька Андрэй аж з табурэткаю адвярнуўся ў мой бок і прагаварыў:

– Бач ты, што ён даказвае. А чым жа ты хочаш быць, можа панам?

– Зараз я яму пакажу яго панскасць, – сказаў бацька, дэманстратыўна распярэзваючы дзягу...

І не ведаю, ці вытрымаў бы я ўсё лета на Чортавым полі, каб не гэтае шкельца. Падобнае яно было на тыя, якія вешаюць ззаду фурманак або машын, толькі не цэлы кружок быў, а нейкая адна трэцяя. Варта было, аднак, прылажыць яго да вока, а другое вока закрыць рукою, каб убачыць цуды-цудныя. Было там рознае: усе звяры, якіх я бачыў калісьці ў кніжцы, што маці прынесла ад папа паглядзець, быў лес, людзі з доўгімі вусамі, коні з людскімі галовамі, было яшчэ многа іншых рэчаў, якія я і назваць не мог. Была і каралева, пра якую чытаў нам пан Хмялеўскі, калі я хадзіў у школу.

Шкельца можна было аглядаць месяцамі, ніколі яно не надакучвала. Заўсёды было ў ім нешта новае. Гледзячы ў шкельца, дастаткова было ледзь-ледзь яго паварушыць і ўсе карціны змяняліся. Каралева ператваралася ў тыгра, а коні – у салдат, якія ішлі ў атаку. Колькі ж цудаў я ўбачыў за тое лета! Праляцела яно хутка на Чортавым полі. Аглядаючы чырвонае шкельца, я зусім забыўся пра тугу.

Надышла зіма. Найбольш я любіў садзіцца ля печкі і глядзець праз шкельца на агонь. У шкельцы было тады ўсё асабліва прыгожым.

– Што ён увесь час тырчыць ля печкі з нейкім шклом?

– сказала аднойчы бабуля, вырываючы з рук мой скарб. Паспрабавала паглядзець і сказала:

– Э, праз яго нічога не відаць...

А мае равеснікі зайздросцілі мне і любілі заглядаць у шкельца. Адзін толькі Рыгораў Грышка неяк прылажыў да вока, глянуў у неба і сказаў:

– Глупства! Праз яго і хмар не відаць...

На другі год, пад восень, шкельца маё знікла. З таго часу пачаліся ўсе мае нягоды.

Я быў перакана75 што шкельца ўкралі хлопцы. Не мог, зразумела, гэтага ім даравацьь. Пры кожным выпадку, а часам нават і без прычыны, кідаўся на сяброў з кулакамі, імкнучыся адпомсціць за сваю страту. У выніку гэтага мне некалькі разоў расквасілі нос, ды, што яшчэ горш, на ўсё жыццё задзіраю празвалі.

Калі падрос і пачаў хадзіць да дзяўчат, дзяўчаты мяне любіць не хацелі. “Вунь задзіра пайшоў!”, – шапталіся яны, калі я ішоў па вуліцы. Я чуў гэтыя шэпты, і на сэрцы было цяжка-цяжка.

– Не ўдаўся ты нам, сынок, – сказаў аднойчы бацька. – Малым быў, то ўсё дзёрся з хлопцамі, ды і цяпер такі самы. Думаў, вырасцеш – паразумнееш, а з цябе чорт ведае што. Няма чаго хадзіць ды гуза шукаць: у суботу паедзем у сваты да Піліпавай Манькі.

Піліпава Манька жыла ў суседняй вёсцы. Была гэта здаравенная дзяўчына і вельмі ж непрыгожая. Я аднак не верыў ужо, каб прыгожая магла згадзіцца выйсці за мяне замуж. І таму згадзіўся ехаць з бацькам у сваты да Піліпавай...

Калі Манька нарадзіла сына, назвалі мы яго Міколкам. З Міколкам любіў я сядзець летам ля хаты і гутарыць. Ён жа нічога не разумее, і ўсё яму можна расказаць. Расказваў я яму аб маім дзіўным жыцці і аб тым шкельцы, ад якога ўсё пачалося. Каб у мяне тады яго не ўкралі, не біўся б я тады з хлопцамі, не празвалі б мяне задзіраю, любілі б мяне дзяўчаты, ажаніўся б я з найпрыгажэйшай дзяўчынай з вёскі, шанавалі б мяне цяпер людзі, і жыў бы сабе прыпяваючы.. А так...

Было гэта мінулай вясной, калі працаваў на агародзе. Выцягнуў плуг з глебы і хацеў зямлю, што прыклеілася, абцерці. І раптам... Аж у вачах пацямнела. Датыкаюся рукою – але ж так, тое самае цудадзейнае шкельца! Хутка абцёр яго і прылажыў да вока. І... нічога не ўбачыў.

Агледзеў я яго яшчэ раз. Але ж не, напэўна, тое самае. Тыя ж самыя невялікія барадаўкі і выбіты зуб з берагу. Пакуль працаваў, разоў пяць яшчэ заглядваў у шкельца. Але, кажу вам, ні звяроў, ні людзей, ні іншых цудаў зусім не было.

Выпрагшы коней, падышоў я да Міколкі і засланіў яму пальцамі адно вока, а да другога прылажыў шкельца. Той віснуў на ўвесь голас і рукамі ўчапіўся за мой вялікі палец.

– На, паглядзі, – сказаў я, падаючы яму сваё цуда.

Міколка як Міколка, пацягнуў яго ў рот і спрабаваў грызці.

– Бэка! – крыкнуў малыш.

Манька, якая мыла побач збанкі, аглянулася і загаласіла.

– Ну, зусім ужо здурэў стары, шкло нейкае дае, хоча дзіця скалечыць!..

Яна вырвала ў Міколкі шкельца і шпурнула за агарод, дзе летам расце крапіва.

Шукаць яго не пайшоў. Навошта? Лепш было б, каб наогул яно не знаходзілася.

Уладзімір Паўлючук

1964

Jurka Hołub

Prosta mowa

Rozkoszuje się rosa, rudzieje
opalenizna majowa.
Z piersi się dźwięki rozleją –
To prosta mowa.

Matczyna chustka rozległa –
Wszechświata stroje nowe.
Brzękom kas niepodległa
Ta prosta mowa.

Budynki bieda budziła
Grzmotem, surowo.
Szopy kraju chroniła
Ta prosta mowa.

Do piekła satrapa strącony,
W okrutne łowy.
Kowadła, sierpa to strony –
Prosta ta mowa.

Łamał huragan z wiosną
Na drwa duhę tęczową.
Żubry kopki na rogach uniosą –
Tę prostą mowę.

Odrzucili onuc zaklęcia,
gdzie z szeptem zmowa.
Usta na zamek zacięte –
To prosta mowa.

W jasną noc

I któż to tak zwabił
Gwiazdę Polarną,
aby do rana pasła się
w rośnych
gwiazdozbiorach?
Czy widział ktoś,
by rzeszoto nieba
cerowały
obłoki?
I długo będziesz wróżyć:
a czemuż to
księżyc huśta się
jak kolczyk
na grodzieńskiej
wieży telewizyjnej...

Przyśniliśmy się jezioru

Jezioro o nas śniło
I jezioro nas wiozło
I aż o litość prosiło
Klonowe mocne wiosło.

Spokojna woda niepłytka,
na brzegu węgle ogniska..
Ktoś, widocznie, na witkach
w ubraniu przysnął.

Takie spokojne mgnienie.
Zielony wiatr tu lata.
Jesteśmy do uwierzenia
Jeszcze bardziej niż latoś.

Jakież mgnienie trwożliwe!
I wojny...
I narodziny...
I jak bliźnięta leżymy
pod sercem u Ojczyzny.

Tłumaczyła Mira Łuksza

Плёткі старой цёткі

Вярталася я неяк ад далёкай сваячкі з Гданьска назад дамоў у Грэдэлі. Пакуль усе плёткі бельскія і падбельскія з ёй не перацёрлі, то не выправілася, а таму крыху запазнілася на вакзал. Паспела аднак забегчы ў першы вагон, думаю дзякаваць богу, білет у кандуктара куплю. Каб ён скіс, той кандуктар, і той цягнік тонканосы!.. Паўпенсіі з мяне паліцай праклятым здзёр, бо выявілася што гэта нейкая там Піндуліна. Я на ўсю гэтую Піндуліну гвалтам пачала раўсці, а яна такая ціхая, што мяне мусіць у хвасце цягніка чулі. Заплаціць усё ж прыйшлося, бо пачалі пагражаць што выкінуць на хуткасці 200 км. Дурная я, трэба было не плаціць і хай бы выкідалі на рамонтным участку, бо як пазней заўважыла, там хуткасць на гадзіну як у нашага старога грэдэльскага каня. Але мондрая Гэля па шкодзе.


Ну, думаю, скуралупы мяне злупілі, дай я хоць раз у жыцці ў люксе пакачаюся. Села, азіраюся, з кім тут языка завязаць, ажно глядзь, каля мяне высокай рангі чын, і то з нашых падляшскіх беларусоў. Называць яго не буду, бо хачу надалей мець уступ на гала-канцэрты, у тэатры і на іншыя такія пасядзелкі. Піндуліна плыве, цішыня, прыемны халадок, диванкі чырвоныя, рыхтык як у мяне ў сенях пасцеленыя. Едзем мы, едзем, а ў беларусоў ёсць такое няпісанае правіла, што пакуль Монькі (калі едзеш з поўначы) ці скажам Шэпетава (калі з захаду) не мінеш, то адзін да другога не прызнаемся і па-беларуску, барані бог, не азываемся. А тут толкам яшчэ нават ад Гданьска не ад'ехаліся, як сусед мой ні з таго ні з сяго, ды яшчэ свойскімі мацюкамі раптам як не загне... Я, каб хоць неяк выратаваць сітуацыю, кажу: „Пан выбачы. Не ест пан в дому.” А ён прыпадымае туфлю і пасаромлены, ужо па-польску будзе казаць: „Не вежэм, але в гувно вдэпнолэм, на пэроне”. Гляджу, ажно і праўда, і тут раптам як дасць па ноздрах, ды па ўсёй Піндуліне як расцягнецца. Ну, думаю, дзякуй табе землячок, за сабачнік за паўпенсіі. Больш чым паўцягніка пустога, але плацкарт ёсць плацкарт, нямецкія парадкі, хоць ты затхніся.

Тут жа паведамілі кандуктару, кандуктар націснуў адмысловы гузік і выклікаў прыбіральшчыцу. Усё хутка, з дапамогай адмысловых, пазалочаных італьянскіх шуфлялёў прыбралі і дыванок нават нечым папшыкалі, але ад смуроду канчаткова пазбыліся калі ўжо пад'язджалі да мэты. Думаю сабе, пракаментаваць ці пачакаць да Монек. Але майму папутчыку трохі пашанцавала, бо калі замест „Беласток” я пачула „Канцавая станцыя Варшава Цэнтральна, дзякуй за супольнае падарожжа”, то забыўшыся на ўсе пісаныя і няпісаныя правілы абклала чыгуначнікаў трох'ярусным з праслоечкай. І толькі гэты на мяне вачыма лыпае і яшчэ абурана кажа: „Пані выбачы. Варшава Цэнтральна”.

Гэля з Варшавы Цэнтральнай



– Kiedy przyjeżdzałam tutaj z turystami, wycieczkami, brakowało w Kruszynianach takiego miejsca, gdzie można by było się zatrzymać. Przyjeżdżałam ze swoją grupą, otwierałam meczet (miałam do niego klucze), oprowadzałam turystów, zamykałam go i musieliśmy jechać dalej. A turyści byli. Przykro mi było ich zostawiać przed tymi drzwiami, ale nie mogłam inaczej. I wiedziałam, że brakuje takiego miejsca w Kruszynianach. Kruszyniany umierały. Meczet był zamknięty...



Хлопец быў малапісьменны, бо не хапала грошай на вучобу. Таму самаадукацыяй займаўся сам. Вельмі шмат чытаў, асабліва любіў творы Максіма Багдановіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа. Менавіта яны натхнялі юнака самому паспрабаваць пісаць. Ён браў паперу, аловак і знікаў на некалькі гадзін. На ўлонні роднай прыроды, каля аднаго стройнага клёна, пісаў паэтычныя радкі. А потым іх акуратна перапісваў у асо... (dalej w kolejnych numerach)

Czasopis

Nr indeksu 355038, ISSN 1230-1876.
Wydawca: Stowarzyszenie Dziennikarzy Białoruskich.
Adres redakcji:
Białystok, ul. Lipowa 4/221.
Adres do korespondencji:
„Czasopis”, 15-001 Białystok, skr. p. 262. **E-mail**: redakcja@czasopis.pl
http://czasopis.pl
Tel. (85) 653 79 66

Redaktor naczelny: Jerzy Chmielewski, tel. 502 661 316. **Zespół redakcyjny**: Wiesław Choruży, Helena Kozłowska-Głogowska, Sławomir Iwaniuk, Magdalena Pietruk (sekretarz redakcji), Tomasz Sulima, Jerzy Sulżyk.
Stali współpracownicy: Piotr Bajko (Białowieża), Joanna Czaban (Krynki), Siarhiej Czyhryn (Słonim), Tamara Bołdak-Janowska (Olsztyn), Agnieszka Goral (Lublin), Mirosława Łuksza, Janusz Korbel (Białowieża), Jan Maksymiuk (Praga), Mateusz Styrczula, Dorota Wysocka, Ewa Zwierzyńska.
Druk: Orthdruk, Białystok.

Prenumerata: Odpowiednio do liczby zamawianych egzemplarzy i okresu prenumeraty należy wpłacić wielokrotność 4 zł na rachunek: Stowarzyszenie Dziennikarzy Białoruskich: Bank PEKAO S.A. Białystok 30 1240 5211 1111 0000 4928 9343.



Беларускі грамадска-культурны часопіс, прысвечаны пытанням сучаснасці, гісторыі, літаратуры і мастацтва, месца чалавека ў свеце. Форум думкі беларусаў і ўсіх тых, каму блізкая беларуская тэматыка. Пазіцыі аўтараў тэкстаў не заўсёды адпавядаюць пазіцыям рэдакцыі. Не публікуюцца матэрыялы, якія прапагандуюць камуна-фашызм, расізм, нацыянальную варожасць.
Artykuły i listy publikowane są – o ile autor nie życzy sobie inaczej – w języku oryginału: po polsku lub białorusku. Redakcja zastrzega sobie prawo do skrótów, zmian tytułów i redagowania nadesłanych tekstów.
Materiałów nie zamówionych redakcja nie zwraca.
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Administracji i Cyfryzacji.
Numer złożono 28 kwietnia 2015.